ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЛЮТАГА 2018 г. ЧАЦВЕР № 32 (28648)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**«Да маёй музыкі трэба дакрануцца»**



**Як маналог пераўтварыць у дыялог?**



**Нефарматны подыум**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Ва ўмовах трансгранічнасці рынкаў пытанне канкурэнтаздольнасці нашых прадпрыемстваў і тавараў стаіць асабліва востра. Неабходна навучыць нашы прадпрыемствы канкурыраваць, а не выкарыстоўваць адміністрацыйны рэсурс міністэрстваў або выканкамаў. Наўнасць бар'ераў, у тым ліку адміністрацыйных, адбіваецца на канчатковай цане для спажыўца і ў сукупнасці стварае дадатковы ціск на інфляцыю. Мясцовы і ведамасны пратэкцыянізм, дырэктыўнае абмежаванне канкурэнцыі, прыняцце дзяржаўнымі органамі некарэктных рашэнняў павінны быць выкаранены. Прычым пажадана як мага хутчэй».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.02.2018 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9901 ▼ |
| Еўра | 2,4618 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0345 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0745 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Справа гонару



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Сямікласнікі Мікіціхінскай сярэдняй школы Шумілінскага раёна ўбіраюць снег на тэрыторыі брацкага пахавання, якое месціцца на ўзбочыне аўтамагістралі Віцебск—Полацк. Кіраўнік класа Вольга Сомава расказала, што яе вучні амаль кожны тыдзень наведваюць магілу салдат, якія загінулі пры вызваленні раёна ў 1944 годзе, наводзяць тут парадак. І наогул, школа шэфствуе над усімі брацкімі пахаваннямі Лаўжанскага сельсавета.**

■ Афганістан: памяць і боль

## ЖАЛОБНАЯ, ГЕРАІЧНАЯ, УРАЧЫСТАЯ ДАТА

**Аляксандр Лукашэнка накіраваў зварот воінам-інтэрнацыяналістам, ветэранам вайны ў Афганістане з нагоды Дня памяці, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Прэзідэнт адзначыў, што гэтая дата навекі жалобная, але ў той жа час геараічная і ўрачыстая.

«Беларусь заўсёды будзе памятаць салдат і афіцэраў, якія прайшлі праз суровыя выпрабаванні, праявілі самаадданасць і адвагу ў гарачых кропках планеты. Тых, хто прыняў на сябе ўдар міжнароднага тэрарызму, які распаўсюджваўся ў тыя гады», — гаворыцца ў звароце.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што цана гэтага жорсткага супрацьстаяння — тысячы жыццяў маладых хлопцаў, рэкі слёз змучаных горам маці, удоў і дзяцей. «Памяць пра страту назаўжды засталася незагойнай ранай для беларускага народа. Мы бясконца ўдзячны лёсу за кожнага воіна, які вярнуўся дадому. Рады за ўсіх, хто знайшоў свой шлях у мірным жыцці», — заявіў Прэзідэнт.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, з'яўляючыся ўзорам мужнасці і гонару, воіны-інтэрнацыяналісты сталі сімвалам вернасці прысязе і воінскаму абавязку, імі ганарацца ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, на іх раўняецца маладое пакаленне.

## ПОДЗВІГ ЗА АПЕРАЦЫЙНЫМ СТАЛОМ

### Як ваенны хірург, рызыкуючы сваім жыццём, дастаў з пацыента гранату

**Тую аперацыю, зробленую спякотным летам у ваенна-палявым шпіталі Кандагара, можна назваць хрэстаматыйнай. Толькі пра ўнікальнае хірургічнае ўмяшанне, якое магло скончыцца трагічна не толькі для пацыента, але і для ваеннага ўрача, не сказана ні ў адным падручніку па медыцыне...**

СТАР. 13

■ Пуцявіны малой радзімы

## ВЕРНУТЫЯ З РУІН

### Якія аднаўленыя помнікі архітэктуры варта наведаць

**Яшчэ з два дзесяцігоддзі таму яны былі пакінутыя, завалены смеццем, ці наогул ад былых велічных будынкаў заставаліся толькі падмуркі. Сёння гэта шыкоўныя палацы, храмы, якія дзейнічаюць, папулярныя турыстычныя аб'екты і культурныя ўстановы. Сярод вернутых помнікаў архітэктуры не толькі Мірскі, Лідскі замкі, палац у Нясвіжы. За гады існавання незалежнай Беларусі рэканструкцыя была праведзена ў самых розных кутках Беларусі, а спіс аднаўленых будынкаў сапраўды немалы. Каб толькі ўспомніць пра такія аб'екты гісторыку Івану САЦУКЕВІЧУ, які і стаў нашым завочным экскурсаводам, спатрэбілася каля гадзіны.**



Цудоўны прыклад таго, як быў вернуты шэдэўральны помнік візантыйскай архітэктуры праваслаўнага дойлідства, — **Дабравешчанская царква** ў Віцебску. Пабудаваны ў XII стагоддзі храм неадназоразва перабудоўваўся, перажыў розныя войны. Нават у гады Вялікай Айчыннай вайны, калі падчас жахлівых бамбардзіровак былі знішчаныя многія пабудовы горада, царква абгарэла, але засталася цэлая. Яе зруйнавалі ў 1961 годзе.

СТАР. 4

■ Выбары-2018

# СТАРТ ДАДЗЕНЫ

**Ідзе датэрміновае галасаванне на выбарах у мясцовыя Саветы**

**У яго першы дзень, 13 лютага, прагаласавалі 4,4 % выбаршчыкаў. Усяго ў барацьбу за дэпутацкія партфелі ўключыліся больш за 22,2 тысячы прэтэндэнтаў. Старшыня ЦВК адзначыла ажыўленне на сёлетніх выбарах.**

Заўважыць гэта можна і па колькасці адкрытых рахункаў для вядзення агітацыі. Сёлета такой магчымасцю скарысталіся 10,4 % кандыдатаў. Гэта амаль у тры разы больш у параўнанні з выбарчай кампаніяй 2014 года. Але гэта невялікі паказчык. Асабліва неактыўныя кандыдаты сельскіх Саветаў — свае рахункі зарэгістравалі толькі 39 чалавек. У ЦВК паступілі 415 вусных і 153 пісьмовыя звароты ад грамадзян і кандыдатаў.

— Самае распаўсюджанае пытанне ад выбаршчыкаў і кандыдатаў — чаму няма інфармацыйных матэрыялаў? З цягам часу яно перастала быць актуальным: матэрыялы грамадзянам прыйшлі. Пыталі таксама, чаму няма агітацыйных матэрыялаў ад кандыдатаў. Тут Цэнтрвыбаркам бяссільны — гэта недапрацоўка саміх кандыдатаў, — паведаміла **старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.**

Адзначаюцца на месцах спробы так званага сацыяльнага шантажу. Людзі пагражаюць не прыйсці на ўчасткі, калі іх патрабаванні па прыборцы снегу ці адмене зносу прыватнага сектара не будуць выкананы.

Падчас агітацыйнай кампаніі ў дэпутатаў была магчымасць бясплатна выступіць па радыё. Такім шанцам скарысталіся толькі 1789 кандыдатаў.

На мясцовыя выбары акрэдытаваныя больш за 28,5 тысячы нацыянальных назіральнікаў. Самыя актыўныя — прадстаўнікі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі: амаль 6,8 тысячы чалавек. Ад Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» балатуецца больш за 5 тысяч кандыдатаў, ад Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — 3,9 тысячы.

Удзельнічаць у маніторынгу выбараў будуць 46 міжнародных назіральнікаў. Гэта супрацоўнікі пасольстваў, якія адкрыты ў Беларусі. Самую вялікую колькасць акрэдытавалі дыпламатычныя прадстаўніцтвы Літвы, Расіі і ЗША.

Лідзія Ярмошына таксама паведаміла, што Беларусь накіруе двух сваіх назіральнікаў на прэзідэнцкія выбары ў Расію.

У асноўны дзень галасавання, 18 лютага, жыхары Беларусі выберуць дэпутатаў у мясцовыя Саветы 28-га склікання. Датэрміновыя выбары працягнуцца да 17 лютага.

**Марыя ДАДАЛКА**

■ Парламенцкі дзённік

# ДЭПУТАТЫ ПАПРАЦАВАЛІ БАНКІРАМІ...

## Якім быць Банкаўскаму кодэксу?

**На вясновай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу мяркуецца правесці другое чытанне праекта змяненняў і дапаўненняў у Банкаўскі кодэкс. Пасля першага чытання на разгляд дэпутатаў паступіла 25 заўваг і прапаноў ад Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Рэспублікі, Камітэта дзяржаўнага кантролю, міністэрстваў фінансаў і юстыцыі, праведзены два пашыраныя пасяджэнні пастаяннай камісіі і чатыры пасяджэнні рабочай групы па дапрацоўцы законапраекта. А нядаўна дэпутаты сумесна з прадстаўнікамі Нацыянальнага банка і найбуйнейшых банкаўскіх устаноў краіны правялі круглы стол, дзе падрабязна абмяркоўвалі будучыя змены ў галоўны дакумент, які рэгулюе банкаўскі сектар.**

### Чатыры блокі змяненняў

**Намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Дзмітрый ЛАПКО** адзначыў, што рэдакцыя Банкаўскага кодэкса, якая будзе вынесена на другое чытанне, прадугледжвае змены чатырох асноўных блокаў.

У першым гаворка ідзе аб пытаннях, звязаных з прывядзеннем Банкаўскага кодэкса ў адпаведнасць з раней прынятымі нарматыўнымі прававымі актамі. У прыватнасці, гаворка ідзе пра Дэкрэт № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва» і Указ № 371 «Аб Беларускім міжбанкаўскім разліковым цэнтры», а таксама некаторыя іншыя дакументы.

У другім блоку прадугледжана ініцыятыва галоўнага ўпраўлення банкаўскага нагляду ў частцы ўкаранення лепшай сусветнай практыкі ва ўдасканаленне парадку рэгістрацыі, ліцэнзавання, вываду з рынку праблемных банкаў, патрабаванняў да заснавальнікаў банкаў.

Трэці блок датычыцца абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг, якія ініцыюе галоўнае ўпраўленне рэгулявання банкаўскіх аперацый. «Тут і пытанні, звязаныя з выдачай і пагашэннем крэдытаў, з дадатковымі паслугамі пры крэдытаванні, з платай за гэтыя паслугі. Былі ініцыятывы стварэння асобнага законапраекта на згаданую тэму, але пакуль мы не бачым у гэтым неабходнасці, таму спыняемся на ўдасканаленні Банкаўскага кодэкса», — удакладніў пазіцыю Нацбанка Дзмітрый Лапко.

Чацвёрты блок узнімае пытанні, звязаныя з пашырэннем паўнамоцтваў фінансавых пасрэднікаў, спрашчэннем парадку рэгістрацыі дзейнасці нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, якія прапануюць альтэрнатыўныя або спадарожныя паслугі банкаў.

### Электронны запыт на таямніцу

Падрабязнасці будучых змяненняў расказаў **начальнік галоўнага юрыдычнага ўпраўлення Нацыянальнага банка Алег КАРНАЧ.** Ён растлумачыў, што ў цэлым законапраект накіраваны на вырашэнне шэрагу актуальных у банкаўскай сферы пытанняў з улікам практыкі і неабходнасці ліквідацыі прабелаў у рэгуляванні, а таксама на ўкараненне новых інструментаў разліку у адпаведнасці з самай лепшай міжнароднай практыкай.

У прыватнасці, кодэкс дапаўняецца палажэннем аб тым, што ў банкаў не можа быць менш за два заснавальнікі. «Агульны падыход у заканадаўстве аб гаспадарчых таварыствах дапускае заснаванне таварыства адной асобай, але гэта непрымальна для банкаўскай сферы, бо выключае прынцып карпаратыўнага кіравання, пакладзенага ў аснову бяспечнага функцыянавання банкаў», — растлумачыў эксперт.

Паводле яго слоў, законапраект накіраваны на ўдасканаленне парадку падачы звестак, якія складаюць банкаўскую таямніцу. У прыватнасці, развіццё тэхналогій і патрэба ў арганізацыі аператыўнага абмену інфармацыяй патрабуе перагляду пераліку падстаў падачы банкамі звестак, якія складаюць банкаўскую таямніцу. «Сёння гэта толькі пісьмовы запыт. Мы ж прапануем унесці і такі від, як запыт у электронным выглядзе з прымяненнем праграмна-тэхнічных сродкаў і тэхналогій, якія дазваляюць пацвердзіць цэласнасць і сапраўднасць дакументаў», — сказаў спецыяліст.

### Калі банк ужо не працуе

На выпадак, калі ў фінансавага інстытута адкліканая ліцэнзія на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці, у законапраект занесены шэраг найважнейшых практычных палажэнняў, якія датычацца выканання абавязацельстваў такога банка. Напрыклад, банк з моманту адклікання ліцэнзіі павінен будзе вярнуць банку-адпраўніку грашовыя сродкі, якія паступаюць на карысць кліентаў банка, а таксама грашовыя сродкі, залічаныя ў выніку тэхнічнай памылкі. «Гэта дазволіць абараніць інтарэсы кліентаў банка і пазбегнуць неапраўданага павелічэння памеру яго запазычанасці перад кліентамі», — удакладніў Алег Карнач.

Яшчэ прапануецца больш не патрабаваць згоду Нацыянальнага банка для самаліквідацыі банкаў. Замест гэтага вызначаецца парадак і тэрміны інфармавання рэгулятара аб рашэнні банка спыніць дзейнасць. Удакладняюцца таксама асаблівасці працэдуры адклікання ліцэнзіі ў такіх выпадках і некаторыя іншыя пытанні. Пры гэтым умовай прыняцця Нацыянальным банкам рашэння аб унясенні запісу аб выключэнні банка з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў з'яўляецца поўнае пагашэнне ўсіх наяўных абавязацельстваў па плацяжах у бюджэт або ў дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды, усіх заяўленых патрабаванняў па наяўных абавязацельствах перад укладчыкамі і іншымі крэдыторамі банка.

### Не змяняць стаўкі па крэдытах

Новай рэдакцыяй кодэкса удакладняецца парадак устанаўлення памеру працэнтаў за карыстанне крэдытам і падыходы да іх налічэння. Замацоўваюцца два падыходы да вызначэння памеру працэнтаў за карыстанне крэдытам: у абсалютным лікавым выражэнні (фіксаваная гадавая працэнтная стаўка) і зыходзячы з разліковай велічыні, прывязанай да базавага паказчыка (зменная гадавая працэнтная стаўка). Парадак вызначэння працэнтнай стаўкі будзе ўзгадняцца бакамі пры заключэнні канкрэтнага крэдытнага дагавора. Пры гэтым уводзіцца забарона на змяненне ў аднабаковым парадку працэнтаў за карыстанне крэдытам.

«Такая ўмова пры ўключэнні ў дагавор будзе лічыцца нікчэмнай. Адпаведна, адзіным спосабам павышэння памеру працэнтаў у аднабаковым парадку будзе выкарыстанне зменнай працэнтнай гадавой стаўкі пры павелічэнні базавага паказчыка», — сказаў Алег Карнач.

У праекце дакумента замацоўваецца яшчэ адно важнае палажэнне, накіраванае на абарону інтарэсаў спажыўцоў фінансавых паслуг. У прыватнасці, калі ўмовай заключэння крэдытнага дагавора з'яўляецца аказанне дадатковых платных паслуг, напрыклад, страхаванне або ацэнка аб'ектаў грамадзянскіх правоў, то фізасоба не можа быць абмежавана ў выбары страхавой арганізацыі або выканаўцы ацэнкі. Таксама ёй у пісьмовай форме бясплатна павінна быць дадзена інфармацыя аб кошце дадатковых платных паслуг.

Калі чалавек адмаўляецца ад дадатковых платных паслуг, якія яму прапануюцца пры заключэнні дагавора, яму павінен быць прапанаваны альтэрнатыўны варыянт выдачы крэдыту, супастаўнага па сумах і тэрмінах без дадатковых платных паслуг. З грамадзяніна не павінна спаганяцца плата за інфармацыю пра ўмовы крэдытавання і разгляд заявы аб выдачы крэдыту і іншых дакументаў, неабходных для гэтага, за адкрыццё бягучага банкаўскага рахунку і залічэнне на яго сум крэдыту. Больш за тое: як мінімум адзін з варыянтаў вяртання фізічнай асобай крэдыту з усіх прадугледжаных у крэдытным дагаворы павінен быць бясплатны. Прадугледжана таксама магчымасць выдачы крэдыту жыхарам краіны толькі ў беларускіх рублях.

**Сяргей КУРКАЧ**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### НЕПАЛАДКІ, ЯКІЯ ПРЫВЯЛІ ДА КАТАСТРОФЫ АН-148, ЗНАЙШЛІ Ў ЛАЙНЕРАЎ SUKHOI SUPERJET 100



Збой у рабоце індыкатараў хуткасці, якія спецыялісты называюць у якасці верагоднай прычыны катастрофы самалёта Ан-148, назіраюцца і ў лайнераў Sukhoi Superjet 100. Пра гэта паведамляе газета «Коммерсант» са спасылкай на тэлеграму Расавіяцыі. Выданне адзначае, што пілоты «Аэрафлота» за тыдзень да трагедыі з Ан-148 скардзіліся на праблемы з разыходжаннем паказанняў хуткасці. За два дні снегападаў 4-5 лютага адбылося сем падобных інцыдэнтаў з SSJ 100, калі адзначалася разыходжанне паказанняў хуткасці ў камандзіра паветранага судна і другога пілота пры ўзлёце або наборы вышыні. Ва ўсіх выпадках самалёты вярталіся на аэрадром вылету. Усяго з 2011 года налічваецца 14 падобных збояў. Расавіяцыя пры гэтым не лічыць, што праблема ў самалётах, а хутчэй, на думку ведамства, у дрэннай рабоце аэрапортаў.

### ІД СПРАБУЕ ЗНАЙСЦІ ПРЫТУЛАК У АФГАНІСТАНЕ І АФРЫЦЫ

Тэрарыстычная групоўка «Ісламская дзяржава» спрабуе ператварыцца ў мяцежную рухі ў Афганістане, Філіпінах, Лівіі і на захадзе Афрыкі. Пра гэта ў Кувейце заявіў дзяржаўны сакратар ЗША Рэкс Тылерсан. Міжнародная антытэрарыстычная кааліцыя павінна працягнуць намаганні па барацьбе з ІД, падкрэсліў дзяржсакратар. Як вядома, у кувейцкай сталіцы на палях міжнароднага форуму па аднаўленні Ірака адбылася пазачарговая міністэрская сустрэча кааліцыі па барацьбе з «Ісламскай дзяржавай».

### ЛІДАР СДПГ МАРЦІН ШУЛЬЦ АБВЯСЦІЎ АБ СВАЁЙ АДСТАЎЦЫ

Старшыня Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (СДПГ) Марцін Шульц абвясціў аб сыходзе са сваёй пасады. Пра гэта палітык заявіў у Берліне. «Гэта мой апошні зварот на пасадзе старшыні СДПГ, — сказаў ён. — Гэта часам складаная праца, але я сыходжу без горычы і крыўды з гэтай пасады». Паводле яго слоў, на пасаду кіраўніка СДПГ праўленнем партыі вылучана кіраўнік фракцыі сацыял-дэмакратаў у бундэстагу Андрэа Налес. Паводле інфармацыі выдання Spiegel, часова выконваць абавязкі лідара партыі будзе намеснік старшыні СДПГ, бургамістр Гамбурга Олаф Шольц.

### КОЛЬКАСЦЬ ЗАГІНУЛЫХ ПАДЧАС КАРНАВАЛУ Ў БАЛІВІІ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ ДА 40



Сорак чалавек загінулі, яшчэ 124 атрымалі траўмы за чатыры дні найбуйнейшага нацыянальнага карнавалу ў Балівіі, перадае ТАСС са спасылкай на заяву міністра ўнутраных спраў краіны Карласа Рамэра. Раней улады Балівіі паведамлялі пра 20 загінулых у выніку некалькіх інцыдэнтаў. «У нас 40 загінулых. На жаль, нягледзячы на кантроль, колькасць смерцяў і траўмаў падчас карнавалу вялікая», — заявіў Рамэра. Карнавал у Аруры — культурная традыцыя ў Балівіі, звязаная са святам Іта карэннага балівійскага народа уру. Свята Іта было забаронена іспанцамі ў XVII стагоддзі, аднак мясцовыя індзейцы працягвалі адзначаць яго пад выглядам хрысціянскай літургіі. Цяпер карнавал праводзіцца штогод і доўжыцца 10 дзён. У 2001-м ён быў уключаны ў спіс шэдэўраў спадчыны чалавецтва ЮНЕСКА. Летась, паводле звестак міністэрства культуры і турызму рэспублікі, святкаванне наведалі 412 тыс. чалавек.

■ Узброеным Сілам — 100 гадоў

# ДОНАР БЯСПЕКІ Ў ЕЎРОПЕ

**Кампактная, мабільная, высокападрыхтаваная і добра аснашчаная армія, здольная супрацьдзейнічаць новым выклікам і пагрозам**

**Такой у найбліжэйшы час бачыцца галоўная мэта развіцця і будаўніцтва Узброеных Сіл Беларусі, аб чым падчас прэс-канферэнцыі паведаміў міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ.**

Тое, што ў тэхнічным плане беларуская армія набывае новы твар, нашы карэспандэнты асабіста не раз пераконваліся. Апошнім часам у войскі штогод трапляе ў сярэднім 25 новых узораў узбраення і ваеннай тэхнікі. Прычым у абнаўленні паркаў воінскіх часцей і злучэнняў актыўна ўдзельнічае і айчынны ваенна-прамысловы комплекс.

Па словах кіраўніка ваеннага ведамства, асноўныя намаганні ў развіцці сучаснай арміі засяроджаны не толькі на пераўзбраенні войскаў, а і на рашэнні задач па аптымізацыі баявога колькаснага складу, захаванні кадравага патэнцыялу, павышэнні ўзроўню ўкамплектаванасці вайсковых часцей і злучэнняў.

Стаўка робіцца на павышэнне мабільнасці, нарошчванне агнявой магутнасці, скарачэнне тэрміну гатоўнасці да выканання задач вайсковымі часцямі і падраздзяленнямі. Безумоўна, удасканальваць сваю баявую падрыхтоўку нашы вайскоўцы працягнуць на шматлікіх вучэннях і мерапрыемствах. У прыватнасці, падчас правядзення камандна-штабной камп'ютарнай гульні, якая сёлета пройдзе ўпершыню.

У межах прэс-канферэнцыі закрануў міністр і рэзанансную крымінальную справу, звязаную з гібеллю салдата тэрміновай службы Аляксандра Коржыча. «Нават адзінкавыя выпадкі гібелі людзей — гэта трагедыя, — падкрэсліў Андрэй Раўкоў. — Нягледзячы на неспрыяльныя тэндэнцыі ў якасных характарыстыках моладзі, летась суіцыд здзейсніл трое салдат тэрміновай службы. Для параўнання: у 1995 годзе зафіксавана 42 факты самазабойства».

Мінімізаваць нестатутныя ўзаемаадносіны ў войсках цяпер дапамога павышаны кантроль за асабовым складам. Камандзіры, якія папярэджваюць правапарушэнні, будуць заахвочвацца. Тыя, хто паспрабуе скрыць падобныя факты, імгненна пакінуць займаемыя імі пасады, а таксама будуць прыцягнуты да адказнасці, у тым ліку крымінальнай. Невыпадкова ў многіх падраздзяленнях устанаўліваюцца тэхнічныя сродкі відэаназірання. Але гэтага недастаткова: каб пазбегнуць трагічных выпадкаў у войску, трэба павышаць матываванасць да праходжання армейскай службы, удасканальваць сістэму дапрызыўнай падрыхтоўкі, проста выхоўваць патрыётаў.

— У адпаведнасці з ваенна-палітычнай абстаноўкай у свеце, у тым ліку ў еўрапейскім рэгіёне, Беларусь паслядоўна рэалізоўвае меры, накіраваныя на забеспячэнне нацыянальнай бяспекі дзяржавы, якія на працягу больш як двух дзесяцігоддзяў дазваляюць захоўваць у краіне мір, стабільнасць і згоду, — перакананы міністр абароны. — Менавіта наша краіна з'яўляецца донарам бяспекі на Еўрапейскім кантыненце, што прызнана міжнароднай супольнасцю. Беларусь не разглядае ні адну з дзяржаў у якасці праціўніка. Каб іх не было і надалей, рэалізуецца міралюбівая шматвектарная знешняя палітыка і адначасова ўдзяляецца прыярытэтная ўвага пытанням ваеннай бяспекі дзяржавы, будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл, якія з'яўляюцца найважнейшым фактарам стрымлівання ад спроб размовы з нашай краінай з пазіцыі сілы.

**Вераніка КАНЮТА**

■ Ведай нашых!

# СЛОВАМІ ПАТРЫЯТЫЗМУ

**Штогод беларускай арміі ў сярэднім прысвячаецца звыш трох тысяч публікацый у друку, каля 150 гадзін тэле- і 80 радыёэфіру**

**Традыцыйна напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Беларусі, якія днямі святкуюць сваё 100-годдзе, найлепшыя журналісты краіны, што знаёмяць аўдыторыю з тонкасцямі вайсковай службы, атрымліваюць заслужаныя ўзнагароды.**



Фота БЕЛТА.

Лаўрэатам штогадовага творчага конкурсу на лепшае асвятленне ў СМІ пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл, патрыятычнага выхавання насельніцтва ў намінацыі «Аўтарскі погляд» каторы год запар стала і наш карэспандэнт Вераніка Канюта.

Пераможцы конкурсу вызначаны ў 17 творчых намінацыях, якія ахапілі ўвесь спектр інфармацыйнай дзейнасці, усе сучасныя жанры, формы і спосабы асвятлення ваенна-патрыятычнай тэматыкі.

— Сёння мы маем права казаць аб высокай эфектыўнасці і выніковасці супрацоўніцтва Узброеных Сіл і сродкаў масавай інфармацыі, — адзначыў падчас цырымоніі ўзнагароджвання **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ**. — Прыкладам таго з'яўляецца асвятленне сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2017», па завяршэнні якога кіраўнік дзяржавы даў найвышэйшую ацэнку работы СМІ. Дзякуючы ім грамадскасць штодзённа знаёміцца з вынікамі развіцця і будаўніцтва Узброеных Сіл нашай краіны. Творчае майстэрства і сапраўдны патрыятызм — найлепшыя якасці беларускага журналіста.

Як заўважыў **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ,** старонкі газет, прысвечаныя розным аспектам жыццядзейнасці Узброеных Сіл, чытаюць ва ўсёй краіне. «Тыя тэлевізійныя і радыйныя праграмы, якія маюць добрыя шматгадовыя традыцыі, з якіх глядач і радыёслухач даведваецца пра сённяшнія падзеі, пра подзвігі, якія здзяйсняюцца салдатамі нашых Узброеных Сіл, безумоўна, прыцягваюць увагу, — перакананы міністр. — Хацелася б, каб гэтая тэма і надалей заставалася галоўнай у плане выхавання насельніцтва і журналісцкіх зносін з чытачом».

**Ул. інф**

■ 50+

# Заняцца гімнастыкай і нарэшце навучыцца маляваць...

**У Мінску з'явілася новая прастора для пажылых людзей**

**Учора практычна ў самым цэнтры сталіцы адкрыўся Цэнтр актыўнага даўгалецця. Тут пенсіянеры змогуць цікава бавіць час і наведваць розныя адукацыйныя курсы.**

Мінчане ва ўзросце за 50 пры жаданні змогуць навучыцца тут асновам прадпрымальніцтва і ландшафтнаму дызайну, засвоіць камп'ютарныя тэхналогіі і сцэнічнае майстэрства, а таксама яшчэ шмат чаго. У Цэнтры будуць працаваць школа па правах пацыентаў, танцавальная група, секцыя па турызме, разнастайныя творчыя майстэрні. Плануецца чытаць лекцыі пра здароўе і пра фітатэрапію, будуць праходзіць заняткі па арт-тэрапіі, арганізоўвацца сацыяльныя турыстычныя паездкі і многае іншае — з больш чым 50 кірункаў самай разнастайнай дзейнасці кожны зможа выбраць сабе занятак па густу.

Цэнтр размясціўся ў будынку пачатку XIX стагоддзя, у якім раней была жаночая яўрэйская гімназія, таксама ў свой час у гэтым доме жыў пісьменнік Янка Маўр. Як адзначае адзін з кіраўнікоў Цэнтра актыўнага даўгалецця Дзмітрый Клімковіч, у найбліжэйшай будучыні ў планах арганізатараў — аднавіць поўную гісторыю гэтага дома, зразумела, з прыцягненнем да гэтай працы і пажылых мінчан — гасцей і наведвальнікаў Цэнтра.

З 13 па 15 лютага ў Цэнтры пройдуць дні адкрытых дзвярэй — мінчан ва ўзросце за 50 запрашаюць наведаць пробныя заняткі, запісацца на ўпадабаны курс, а таксама аформіць бясплатную інфармацыйную падпіску на рэгулярныя праграмы.

Цэнтр актыўнага даўгалецця размясціўся па вуліцы Мяснікова, 76.

**Святлана БУСЬКО**

# Ураган на Алімпіядзе

**З-за моцнага парывістага ветру ўчора перанеслі спаборніцтвы па біятлоне і гарналыжным спорце**

**На Пхёнчхан абрынуўся сапраўдны ўраган, вецер разграміў пункты допуску гледачоў у алімпійскім парку, парывамі зносіліся асобныя лёгкія канструкцыі. Дзясяткі валанцёраў уручную ўтрымлівалі палаткі, каб іх не знесла ветрам. Адзін з карэйскіх балельшчыкаў ледзь утрымаў каляску з дзіцем. Арганізатары па гучнай сувязі папярэджвалі аматараў спорту аб небяспецы знаходжання на вуліцы. *«З прычыны моцнага ветру на вуліцы заставацца небяспечна. Калі ласка, зайдзіце ўнутр аб'ектаў або рэстаранаў»,* — гучала ў алімпійскім парку. Пазней яго і зусім закрылі.**

З-за такой пагоднай абстаноўкі спачатку быў адменены гарналыжны слалам у жанчын, у якім павінна была выступіць наша Марыя Шканава. Чакаецца, што гонка адбудзецца заўтра, 16 лютага. Нагадаем, Марыя плануе спаборнічаць у слаламе, гігацкім слаламе і супергіганце. Пазней арганізатары Алімпійскіх гульняў паведамілі і пра перанос біятлоннай індывідуальнай гонкі ў жанчын на 15 км. Яна адбудзецца сёння ў 11.15, мужчыны выйдуць на старт у гэтай дысцыпліне ў 14.20.

Яшчэ адна навіна прыйшла з кластара Канына. Канькабежка Таццяна Міхайлава не выйшла на старт дыстанцыі 1000 м. Трэнерскі штаб беларускай каманды даў магчымасць спартсменцы засяродзіцца на падрыхтоўцы да масстарту, які пройдзе ў жанчын 24 лютага.

## Валейбол на зімовых Гульнях

Снежны валейбол быў прадстаўлены на зімовых Алімпійскіх гульнях у Пхёнчхане. Матч быў арганізаваны Міжнароднай федэрацыяй валейбола, Еўрапейскай канфедэрацыяй валейбола і Алімпійскім камітэтам Аўстрыі.

У матчы ўзялі ўдзел сусветныя зоркі класічнага і пляжнага валейбола — алімпійскія чэмпіёны бразілец Жыба і серб Уладзімір Грбіч, трохразовы прызёр Алімпіяд Эмануэль Рэго, карэянка Кім Ен Кун, кітаянка Сюэ Чэнь і іншыя. У 2016 годзе ў Еўропе ўпершыню ў гісторыі прайшла серыя з трох афіцыйных турніраў па валейболе на снезе, а ў 2026 годзе магчыма афіцыйнае ўключэнне дысцыпліны ў праграму Алімпійскіх гульняў.

## Ледзь не праспаў Алімпіяду

17-гадовы амерыканскі сноўбардыст Рэдманд Джэрард ледзь не спазніўся на свой алімпійскі старт. Каманда ЗША заўважыла адсутнасць спартсмена літаральна за некалькі гадзін да пачатку спаборніцтваў, тэлефон Рэдманда не адказваў. Аказалася, што напярэдадні старту Рэдманд да ночы глядзеў серыял «Бруклін 9-9». Раніцай ён зразумеў, што вельмі моцна спазняецца, і ад панікі нават не змог знайсці сваю куртку — прыйшлося пазычаць вопратку ў партнёра.



Праз некалькі гадзін ён паказаў неверагодны вынік у слоўпстайле і ўзяў «золата» Алімпіяды. Перад паездкай у Пхёнчхан Джэрард сказаў, што не разумее важнасці Алімпіяды, галоўным спаборніцтвам для яго заўсёды былі X-Games. А пасля ён нават не пазнаў кіраўніка Міжнароднага алімпійскага камітэта Томаса Баха, калі той павіншаваў амерыканца з алімпійскім «золатам».

Бацька Рэдманда Джэрарда адзначае, што яго сын з таго пакалення, якое не глядзіць тэлевізар, ён заўсёды глядзіць у свой смартфон, і хлопец сапраўды ніколі не глядзеў Алімпіяду. Сам Джэрард не ўпэўнены, што вырашыць удзельнічаць у Алімпійскіх гульнях яшчэ раз. «Я з тых хлопцаў, якія жывуць адным днём. Хачу крыху паздымаць відэа пра сноўборд. Займаюся гэтым два гады, а далей вырашу, куды ісці».

## Пачуццё гумару і стылю



Падчас трансляцыі алімпійскіх спаборніцтваў скакуноў з трampліна ўвага гледачоў была прыкавана да нарвежскага спартсмена Роберта Юхансана. Калі забыць, што на двары 2018-ы, па вонкавым выглядзе скакуна можна падумаць, што гэта Гульні пачатку 1900-х. Да Алімпіяды ў Пхёнчхане Юхансан адгадаваў спецыяльныя вусы, у сацыяльных сетках сам пра сябе ён напісаў: «Нарвежскі скакун з трампліна з вусамі».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ВЕРНУТЫЯ З РУІН



Палац у Красным Беразе.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Каб спыніць гэты вандалізм, у Віцебск з пратэстамі прыязджалі мастацтвазнаўцы, вядомыя людзі з Масквы і Ленінграда, але выратаваць храм не ўдалося, ад яго засталіся толькі кавалкі сцен. У канцы 70-х рэшткі царквы былі ўзятыя пад ахову дзяржавы. А ў сярэдзіне 90-х помнік адноўлены, прычым па мяркуемым першапачатковым знешнім выглядзе XII стагоддзя, без пазнейшых напластаванняў і перабудоў. Калі будзеце ў Віцебску, звярніце ўвагу на неатынкаваны фрагмент храма — гэта кавалкі арыгінальнай сцяны старажытнага будынка.

Актыўна праводзяцца рэстаўрацыйныя работы ў **Сынкавічах**. Хоць яшчэ не так даўно гэты гатычны храм быў закінуты, выкарыстоўваўся пад калгасныя склады, а за сто метраў ад яго размяшчаўся кароўнік. А вось у **касцёле Святога Андрэя ў Слоніме** ў савецкі час быў склад солі. Яна ўелася ў тынкоўку і сцены, і працягвае праступаць нават пасля рэстаўрацыі і рамонту — і, на жаль, ад такіх «шрамаў» ужо не пазбавіцца.

Абавязкова завітайце ў **Любчу**. Тут за аднаўленне старажытнага радзівілаўскага замка, які быў спалены ў сярэдзіне XVII стагоддзя, узяліся месцічы — браты Пячынскія. Да іх далучыліся шматлікія валанцёры, студэнты БНТУ бясплатна рабілі праект, будаўнічыя кампаніі дапамагалі матэрыяламі.

Вядуцца размовы пра аднаўленне **Быхаўскага замка.** Тым больш, нядаўна прайшла інфармацыя пра тое, што ў адным з еўрапейскіх архіваў знайшлі графічную ілюстрацыю выявы гэтага помніка. Між іншым, першыя работы тут былі ўжо праведзеныя — напярэдадні дажынак частку будынка закансервавалі, другую аднавілі, добраўпарадкавалі навакольную тэрыторыю.

Цудоўны прыклад рэстаўрацыі ў Мінску — былая ўніяцкая **царква Святога духа.** Гэты храм быў узарваны ў 1936 годзе, захаваліся толькі родныя падмуркі XVII стагоддзя. Удалося знайсці фінансаванне, і храм адноўлены па ўнікальнай тэхналогіі. Каб не пашкодзіць арыгінальныя сцены (былі апасенні, што яны могуць не вытрымаць нагрузкі сучасных будаўнічых матэрыялаў, акрамя таго праблемы маглі ўзнікнуць з-за «суседства» з метро), зроблены жалезабетонныя перакрыцці, і на іх аснове нарошчваўся новы аб'ём, які поўнасцю паўтарае першапачатковы выгляд старажытнага храма. Зараз там размяшчаецца канцэртная зала. Пры жаданні можна прайсціся ўздоўж магутных аўтэнтычных сцен XVII стагоддзя (трэба спусціцца на падвальны паверх). Іван Сацукевіч адзначыў, што было б добра, каб тут пачаў дзейнічаць які-небудзь тэматычны музей, напрыклад, гісторыі старажытнай плошчы Мінска — Высокага Рынка.

Выберацеся на экскурсію ў Нясвіж, пасля наведвання адрэстаўраванага знакамітага палаца, прагуляйцеся па **Ратушнай цэнтральнай плошчы Нясвіжа.** У XIX стагоддзі падчас пажару ратуша моцна пацярпела, абваліліся два яе ярусы. Яе аднавілі, але з тэхналогіямі XIX стагоддзя цяжка было вярнуць будынку першапачатковы выгляд, гэта змаглі зрабіць толькі ў XXI стагоддзі.

Адзін з самых прыгожых палацавых комплексаў — **Ружаны,** пабудаваны ў другой палове XVIII стагоддзя, — быў зруйнаваны немцамі ў 1944 годзе пры адступленні. Рэстаўрацыйныя работы тут яшчэ вядуцца, але на адноўленай тэрыторыі ўжо пачаў працаваць музей з даволі цікавымі экспанатамі.

Абавязкова пабывайце ў **Красным Беразе** (Жлобінскі раён). Такіх прыгожых інтэр'ераў, як у тутэйшым палацы, дзе рэстаўрацыя закончылася летась, вы нідзе ў Беларусі не сустрэнеце. Кожная зала аформлена ў сваім стылі: класіцызм, мадэрн, эклектыка, Усход, Афрыка. Будынку пашанцавала: яго не разбілі, не спалілі, у гады вайны немцы зрабілі там шпіталь для параненых. Пасля тут размяшчаўся сельскагаспадарчы тэхнікум. Дарэчы, гэты палац у свой час належаў Козел-Паклеўскім — аднаму з найбагацейшых родаў Расійскай імперыі, беларусам па паходжанні, якія аказаліся ў Сібіры, з часам сталі паспяховымі бізнесменамі (у іх было каля пятнаццаці вялікіх заводаў за Уралам).

**Палац Пацёмкіных у Крычаве** — рэдкі ўзор эклектыкі канца XVIII стагоддзя, будынак у савецкі час, сёння ўжо гатовы да прыезду турыстаў, тут працуе музей, мясцовых жыхароў і гасцей запрашаюць на канцэртна-забаўляльныя і інтэрактыўныя мерапрыемствы.

Некалькі месяцаў таму былі адкрыты для наведвання пяць залаў на першым паверсе **палаца Пуслоўскіх у Косаве,** але для таго каб падаць гэты будынак ва ўсёй красе, давядзецца прыкласці яшчэ шмат часу і грошай. І не забудзьцеся наведаць **Мерачоўшчыну — адноўленую сядзібу Тадэвуша Касцюшкі,** што знаходзіцца паблізу.

Не будзем забывацца і пра **сядзібна-паркавы комплекс Нямцэвічаў — Скокі** ў ваколіцах Брэста, у мінулым стагоддзі там яшчэ працавала школа, але яе закрылі ў 80-х гадах, і пэўны час будынак стаяў з забітымі дошкамі вокнамі. Два гады назад завяршылася рэстаўрацыя, і ў тутэйшым музеі ладзяцца разнастайныя акцыі, сустрэчы, канферэнцыі, семінары, праводзіцца анімацыйная праграма, звязаная з гісторыяй Першай сусветнай вайны (успомнім, што ў Скоках было падпісана ваеннае перамір'е).

**Палац Бутрымовічаў у Пінску** «падкінуў задачку рэстаўратарам». Калі ў XVIII стагоддзі ён узводзіўся, будаўнікі паспрабавалі вырашыць праблему з грунтавымі водамі. Уздоўж перыметра фундамента была зроблена своеасаблівая гідраізаляцыя — выкопваліся глыбокія канавы і туды забіваліся дубовыя дошкі. У наш час, калі вяліся работы па аднаўленні палаца, старая «дубовая» ізаляцыя была пашкоджана і пачаліся праблемы з вільгаццю, але нарэшце ўдалося з імі справіцца, і сёння ў будынку працуюць палац шлюбаў і музей.

Адзін з самых велічных палацавых комплексаў Беларусі — **Жылічы** (па памерах нічым не саступае Нясвіжскаму) знаходзіцца на Магілёўшчыне ў Кіраўскім раёне. Там ужо завяршылі першую чаргу рэстаўрацыі, актыўна вядзецца другая. Турыстам так рады, што пускаюць іх нават на будаўнічы аб'ект, дзе можна ўбачыць, як вядзецца рэстаўрацыя і якая ступень захаванасці арыгінальных столяў.

Канешне, успамінаюцца і іншыя аб'екты, адноўленыя ў апошнія дзесяцігоддзі, але бясспрэчна, яшчэ многа чаго можна зрабіць, і, як упэўнены Іван Сацукевіч, пакуль ёсць цікавасць грамадскасці да праблем аднаўлення помнікаў, згаданая тэндэнцыя будзе моднай, папулярнай, а людзі будуць далучацца да гэтага працэсу.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*Трэба сказаць, што сустрэча, прысвечаная тэме «Аднаўленне помнікаў архітэктуры ў гады незалежнай Рэспублікі Беларусь», праводзілася Нацыянальным гістарычным музеем, які сумесна з Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі сёлета ладзіць шэраг лекцый-дыскусій, удзельнікамі якіх могуць стаць усе, хто цікавіцца гісторыяй і культурай сваёй краіны.*

■ Медыяпрастора

# СУМЛЕННЫЯ СТАРОНКІ «СРЕТЕНИЯ»

## Сёння — Стрэчанне. Беларусы яшчэ называюць гэта свята Грамніцы. Лічыцца, што ў гэты дзень адбылася сустрэча Старога і Новага Запаветаў, Старажытнага свету і хрысціянства

**20 гадоў у Гомелі выдаецца праваслаўны часопіс «Сретение», які ажыццяўляе сувязь паміж людзьмі, якія толькі паглядаюць у бок храма, і тымі, хто ў ім ужо знаходзіцца.**



Члены рэдкалегіі часопіса «Сретение»: протаіерэй Вадзім Качан, паэт Іван Бісеў, публіцыст Галіна Старшынава, гісторык Ірына Грышчанка.

Як пройдзе тое спатканне — не ведае ніхто. Хіба толькі Той, хто сабраў першую групку энтузіястаў у канцы 90-х гадоў у бібліятэцы на краі горада, у Любенскім мікрараёне. Тады яна называлася ў гонар Максіма Горкага, цяпер носіць імя сусветна вядомага асветніка, які жыў на землях паўднёвага Палесся, — свяціцеля Кірылы Тураўскага.

Антаніна Уварава была і застаецца той самай загадчыцай гомельскай бібліятэкі № 11 (цяпер гэта філіял № 8), якая дазволіла збірацца на тэрыторыі свецкай установы людзям, што імкнуліся да веры:

— Усё пачалося з ідэі арганізаваць сустрэчу чытачоў бібліятэкі са святаром. У Гомелі ў сярэдзіне 90-х было ўсяго чатыры храмы і мелася вялікая цікавасць да праваслаўя, яго традыцый і культуры. Наша чытальная зала пастаянна запаўнялася людзьмі — такая духоўная прага існавала. Здаецца, цяпер сабраць такую аўдыторыю куды складаней. А тады, па просьбе людзей, мы сталі збірацца зноў і зноў. Так пачалася работа нядзельнай школы — спачатку для дарослых, а потым і для дзяцей. Дзіўным было і тое, што дастаткова сціплую па гарадскіх мерках аўдыторыю на ўскраіне наведвалі са сваімі лекцыямі такія выдатныя і вядомыя асобы, як прафесар Маскоўскай духоўнай акадэміі Аляксей Осіпаў, кіраўнік маскоўскага цэнтра па рэабілітацыі ахвяр таталітарных сектаў святар Алег Сцяняеў, выдатны маскоўскі педагог, протаіерэй Арцемій Уладзіміраў... Не раз на пытанні наведвальнікаў бібліятэкі адказваў і тагачасны архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх (Станкевіч). Зразумела ж, артыкулы ў аматарскім выданні расказвалі і пра гэтыя сустрэчы.

Невялічкі — у дзясятак квадратных метраў — бібліятэчны пакойчык, дзе няма вокнаў, але ёсць абразы, стаў прытулкам для людзей, якія самі шукалі шлях да Бога і іншым спрабавалі дапамагчы гэта зрабіць. Дарэчы, гэта частка і маёй асабістай гісторыі, якая сёння — у пажоўклых лістках першых нумароў газеты «Лампада». Так, гэта была самая першая назва таго самага выдання, пра якое тут ідзе размова.

Старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных і прававых дысцыплін ГДТУ імя П. Сухога Ірына Грышчанка — адна з пастаянных аўтараў часопіса. Галоўная тэма яе даследаванняў — гісторыя сусветнай культуры і гісторыя Беларусі. Для часопіса піша многа і не толькі на краязнаўчыя тэмы:

— Момант нараджэння чалавека — гэта яго сустрэча з гэтым светам, людзьмі, якія зоймуць у яго жыцці важнае месца. Мы на нашым жыццёвым шляху сустракаем розных людзей. Я ўдзячная Богу за інтэрв'ю з цікавымі людзьмі, якія давялося ўзяць для нашага часопіса. Гэта — мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт (Вахрамееў), нашы гомельскія архіепіскапы Арыстарх (Станкевіч) і Сцяфан (Нешчарэт), знакаміты святарвандроўнік Фёдар Конюхаў, вялікі дырыжор Уладзімір Співакоў і музыканты Юрый Шаўчук, Вячаслаў Бутусаў, Пётр Мамонаў... Без прапаведзі любові да блізкіх няма хрысціянства — у гэтым сутнасць нашай веры. Таму ўсе госці нашага часопіса, так ці інакш, закранalі гэтую тэму. Глыбокае ўражанне засталося ад аповеду архіепіскапа Гомельскага і Жлобінскага Сцяфана пра святога праведнага Іаана Кармянскага. Менавіта ў жывых стасунках можна адчуць, што значыць святыня для чалавека.



Сярод пастаянных аўтараў «Сретения» ёсць шмат вядомых клірыкаў мясцовых цэркваў. Архімандрыт Сава (Мажука) з гомельскага Нікольскага мужчынскага манастыра http://zviazda.by/be/news/20180123/1516724813-arhimandryt-sava-prezentavau-knigu-nepazbezhnasc-pashi дагэтуль аддае свае артыкулы не толькі на маскоўскія інтэрнэт-парталы, але і ў часопіс, які ўжо завяваў годнае месца сярод праваслаўных выданняў нашай краіны.

Архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Сцяфан гаворыць, што часопіс «Сретение» — жывое сведчанне таго, як з іскры можа разгарэцца полымя:

— Дваццаць гадоў таму ўсё пачыналася з выпуску невялікага лістка, які зваўся «Лампада». Гэта быў такі, як казалі ў савецкі час, «самвыдат», якім займалася група энтузіястаў. цяпер мы маем выдатна аформлены часопіс, які расказвае пра жыццё епархіі, пра святасць, пра тое, як здабыць і не страціць шлях да Бога, пра прыгажосць жыцця паводле Евангелля.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ** ■

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

15 ЛЮТАГА 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 4 (15835)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

## Канстанцін ЯСЬКОЎ:

# «ДА МАЁЙ МУЗЫКІ ТРЭБА ДАКРАНУЦЦА»



**Сучаснасць кінула выклік класічнай музыцы. Часы Шапэна, Бетховена і Моцарта прайшлі, і сёння прадстаўнікоў гэтай прафесіі мала хто ведае, асабліва з аматараў «папсы». Нягледзячы на гэта, беларускую класічную музыку працягваюць ствараць сапраўды апантаныя, сярод іх — малады кампазітар і выкладчык Канстанцін ЯСЬКОЎ, творы якога можна пачуць у некаторых спектаклях, філарманічных залах і на ўласных альбомах аўтара. Сёлета ён стаў яшчэ і наватарам — першым у Беларусі паспрабаваў свае сілы ў папулярнай за мяжой музычнай форме Composer in residence.**

***— Канстанцін, музыка ў якасці прафесіі была вашым свядомым выбарам?***

— Мае бацькі яе выкладаюць, таму іншага лёсу, напэўна, не было. Хоць да апошняга моманту ў мяне былі пытанні, якую прафесію выбраць, але вырашыў, што трэба ісці менавіта гэтым шляхам. Я вучыўся ў Гродзенскім музычным вучылішчы як піяніст, а паралельна вывучаў кампазіцыю ў Віталя Радзівонава, дарэчы, мне яна падабаецца больш за выкананне музыкі: заўсёды бачыў тут шмат плюсоў у выглядзе ўласнай творчасці.

***— Як лічыце, у нас разумеюць каштоўнасць айчыннай музыкі?***

— Сітуацыя ў нас такая, што трэба прывіваць любоў да яе. І думаю, што спачатку варта рабіць гэта мэтанакіравана, каб пасля працэс стаў натуральным. Перакананы, што ў праграме кожнага калектыву павінен быць хоць невялікі твор беларускай музыкі, і не абавязкова стары, а часам прэм'ерны. Не сакрэт, што ў дзяржаўных калектываў ёсць план па канцэртах: можна дадаць туды і беларускую музыку — з такіх крокаў пачынаецца пазнаванне айчыннай творчасці. Любоў у гэтым сэнсе — адноснае паняцце, а калі дапамагчы слухачу дайсці да беларускай музыкі спачатку дырэктыўна, ужо праз 5-10 гадоў вынікі будуць заўважныя, а айчынныя творы пачнуць пазнаваць, яны будуць звыклымі для вуха. Бо як можна любіць ці не любіць тое, да чаго не дакранаешся? У нас проста не ведаюць, што беларуская музыка — выдатная, зараз яна вельмі розная і дакладна не горшая за замежную.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Добрыя сэрцам

# «Надзея» дорыць усмешкі

## ГЭТА — «СПРЫТНАСЦЬ РУК І НІЯКАЙ МАГІІ»

**«Для таго каб дапамагаць іншым, не патрэбна нічога, акрамя жадання», — так лічаць удзельнікі валанцёрскага атрада «Надзея» лунінецкай сярэдняй школы № 4. І даказваюць гэта на ўласным прыкладзе: па выніках рэспубліканскага конкурсу БРСМ «Валанцёр года — Добрае Сэрца» за мінулы год яны былі пераможцамі ў намінацыі «Найлепшы валанцёрскі атрад сярод вучнёўскай моладзі».**



«Надзея» існуе толькі трэці год, але за гэты час лунінецкія валанцёры паспелі правесці сотні дабрачынных акцый і ўбачыць тысячы ўсмешак тых, каму дапамаглі. У атрадзе ўсяго 25 чалавек, затое якіх! Гэта самыя актыўныя і яркія вучні 8—11 класаў школы. Іх пад сваім крылом сабрала педагог-арганізатар Юлія Богуш — куратар атрада.

— Мы працуем па некалькіх напрамках. Галоўны — дабрачыннасць. Акрамя гэтага, займаемся яшчэ і экалагічным валанцёрствам, а таксама прасоўваем ідэі здаровага ладу жыцця, — расказвае Юлія. — Умоўна атрад можна падзяліць на некалькі невялікіх груп, кожная з якіх займаецца тым, што ёй бліжэй. Напрыклад, хлопцам і дзяўчатам з 10 «Б» падабаецца экатэма. Яны ў нас звычайна даглядаюць лесапаркавую зону, замацаваную за атрадам. Іншыя кожную трэцюю суботу наведваюць адзінокага ветэрана вайны Пелагею Канстанцінаўну Крэменеўскую. Яна да нашых валанцёраў ужо так прызвычаілася, што лічыць сваімі «ўнукамі».

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Педсавет

# ЯК МАНАЛОГ ПЕРАЎТВАРЫЦЬ У ДЫЯЛОГ?

**Эўрыстычныя заданні — супраць заштампаванасці мыслення**

**«У ходзе работы ў мяне з'явілася асацыяцыя, што я, як той барон Мюнхгаўзен, які ўзяў сябе за валасы і сам выцягнуў з балота. Чаму з'явілася менавіта гэта асацыяцыя? Напэўна, таму, што я інакш паглядзела на адукацыйны працэс».**

**«Кухня творчага працэсу складання эўрыстычнага задання дапамагла мне раскрыцца і працаваць творча, па-іншаму паглядзець на звыклыя рэчы, у рэшце рэшт праверыць свае веды і ўменне мысліць нестандартна. І яшчэ ўбачыць сувязь не толькі з вучэбнай практычнай дзейнасцю, але і з паўсядзённым жыццём. А гэта, напэўна, самае галоўнае».**

**І першая, і другая думка належыць слухачам курса «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава». Што ж прымусіла дарослых і самадастатковых людзей зноў сесці за парту?**

### ЧАМУ ШМАТ ВЕДАЎ — НЕ СІНОНІМ ПОСПЕХУ?

— Ёсць выкладчык і ёсць студэнт, настаўнік і вучань — і ад таго, як арганізаваны паміж імі дыялог, у вялікай ступені залежыць вынік, — тлумачыць **рэктар БДУ, доктар педагагічных навук Андрэй КАРОЛЬ**, які і з'яўляецца аўтарам курса. — Сёння, на жаль, адукацыя ўяўляе сабой, хутчэй, маналог. Калі казаць пра характар стасункаў паміж выкладчыкам і студэнтам, настаўнікам і вучнем, то гэта ёсць не што іншае, як трансляцыя педагогам сацыяльна адаптаванага культурна-гістарычнага досведу сваім выхаванцам без уліку іх індывідуальнасці. Хоць насамрэч досвед транслюваць нельга, ён павінен выпрацоўвацца асабіста.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



**Андрэй Кароль: «Сённяшнія студэнты — гэта заўтрашнія менеджары, і яны павінны быць крэатыўнымі, гнуткімі і мабільнымі...»**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
15 02 2018 г.

# ЯК МАНАЛОГ ПЕРАЎТВАРЫЦЬ У ДЫЯЛОГ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Мудрасць, якую спрабуюць перадаць іншаму чалавеку, заўсёды гучыць як глупства, таму што ў кожнага свая мудрасць і свая праўда... А трансляцыя гатовай інфармацыі, упакаванай і расфасаванай па розных дысцыплінах і вучэбных планах, прыводзіць да таго, што з кожнай гадзінай у маладога чалавека прыбывае ўсё больш гатовых ведаў. Несці сумку ўсё цяжэй, але самае крыўднае, што, пакуль гэтыя веды яму транслююцца, яны ўжо паспяваюць састарэць. Адзін з любімых вучняў Сакрата Арысціп казаў: «Калі хтосьці шмат есць, гэта не значыць, што ён здаровы». У нашай рэчаіснасці быць экіпіраваным ведамі яшчэ не азначае ўменне іх прымяніць. **Каштоўнасць ведаў залежыць ад спосабу іх атрымання, але студэнтаў і навучэнцаў пазбаўляюць магчымасці ўдзельнічаць у кухні па «прыгатаванні» — іх падаюць ім на спадачку ў гатовым выглядзе...**

Аўтарскі курс Андрэя Караля акумулюе больш чым дваццацігадовы навуковы вопыт і веды ў галіне эўрыстычнага навучання. Гэта своеасаблівая школа педагагічнага майстэрства для тых, хто гатовы адарвацца ад старых жоўтых канспектаў, адысці ад лекцыйнай формы навучання, якая ўсё яшчэ працягвае пераважаць у вышэйшай школе, і паглядзець на вучэбны працэс пад іншым вуглом. Курс скіраваны на развіццё эўрыстычных якасцяў у выкладчыка, здольнага дзейнічаць у сітуацыі нявызначанасці, калі няма гатовых рашэнняў. Ён уключае тры семінары: «Ці можна навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава? Як распрацаваць адкрытае (эўрыстычнае) заданне»; «Як распрацаваць і правесці заняткі эўрыстычнага тыпу» і «Як спраектаваць і правесці эўрыстычныя інтэрнэт-заняткі».

Удзельнікамі першага семінара сталі каля 150 педагогаў і выкладчыкаў БДУ, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, ліцэя БДУ і чатырох каледжаў. Адначасовае павышэнне кваліфікацыі педагогаў усіх ступеняў адукацыі — агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай — праходзіла ў міжсеткавым рэжыме. А стасункі, дыскусіі і абмеркаванні адбываліся ў рэжыме анлайн. Яшчэ адна адметнасць семінара заключаецца ў тым, што тут адсутнічае пасіўнае слуханне. Спасціжэнне інфармацыі адбываецца праз актыўнае дзеянне, пастаноўку мэт, распрацоўку ўласных адукацыйных прадуктаў (камплекта адкрытых заданняў, сцэнарыя заняткаў ці інтэрнэт-заняткаў), якія могуць быць задзейнічаны ў далейшай рабоце.

## НЕ ДАЦЬ ВЕДЫ, А АРГАНІЗАВАЦЬ ІХ ПОШУК

— Ці можна глядзець на свет нестандартна і нешаблонна, калі табе транслююць стандартную шаблонную інфармацыю? — разважае Андрэй Кароль. — Адкрыццё — гэта погляд на свет сваімі вачамі, а не чужымі. Чаму ў нас хапае выпускнікоў школ з залатымі медалямі і выпускнікоў ВНУ з «чырвонымі» дыпломамі, але адсутнічаюць рэальныя крэатыўныя прарыўныя рашэнні? Больш таго, часта працадаўцы кажуць: «Забудзьцеся пра ўсё, чаму вас вучылі». Гэта, канешне, крыху ўтрыравана, але тым не менш сістэма трансляцыі загадзя правільнай інфармацыі не развівае творчы пачатак, які ёсць у кожным з нас. Атрыманае ад іншых, як правіла, страчваецца. Чаму студэнты часта кажуць: «Зразумеў я многае, але нічому не навучыўся»?

**Эўрыстычнае навучанне — гэта навучанне на аснове дыялогу, якое раскрывае вучня.** Кожны навучэнец стварае свой адукацыйны прадукт. Яму прапануецца не ўзяць напрамую і засвоіць дасягненні чалавецтва (рэалізаваць маналагічны падыход), а вывучаць аб'екты рэчаіснасці (прыроды, тэхнікі, культуры, навукі) самастойна, па прапанаваным педагогам алгарытме. Найважнейшым элементам эўрыстычнага навучання выступае адкрытае заданне, на якое ў кожнага можа быць свой адказ і якое раскрывае ўнутраны патэнцыял навучэнца, матывуе яго на пошукі. Функцыі выкладчыка/настаўніка пры гэтым таксама змяняюцца — не даць веды, а арганізаваць іх пошук. На другім этапе сваё супастаўляецца з чужым — назапашанымі чалавецтвам ведамі ў рамках пэўнай вучэбнай тэмы. У выніку дыялогу свайго з чужым вучань здзяйсняе ўласныя адкрыцці, спазнае сябе... **У дыялагічнасці навучання закладзена магчымасць асабістага росту для студэнта ці школьніка: апошні вучыцца ставіць уласныя мэты, супастаўляць, аналізаваць, развівае свае крэатыўныя якасці, стварае ўласны адукацыйны прадукт...** Раней адукацыйныя стандарты заставаліся нязменнымі цягам дзесяці — дваццаці гадоў, а цяпер кожныя год-два кампетэнцыі, што патрабуюцца ад выпускнікоў, пераглядаюцца. Таму востра стаіць пытанне: чаму вучыць студэнта?

— Напэўна, трэба вучыць вучыцца, таму што вучыць чамусьці — гэта значыць, арыентавацца на мінулае, — дзеліцца сваімі думкамі рэктар БДУ. — Між іншым, нашы вучні становяцца ўсё больш маналагічнымі: яны не чуюць ні сябе, ні іншых. Адсюль высокая ступень трывожнасці, шаблоннасць паводзін і мыслення. Цяга да ведаў знікае разам з пашырэннем доступу да любой інфармацыі. Трэба разварушыць гэта кола.

## ТРАПІЦЬ У МАТЫВАЦЫЙНУЮ «ВАРОНКУ»

*«Уявіце, што вы слова. У які сказ вы хацелі б трапіць, якую сэнсавую нагрузку хацелі б несці? І, трапіўшы ў тлумачальны слоўнік, якое значэнне вы надалі б свайму слову?»* — гэта адзін з прыкладаў адкрытага задання па рускай мове на тэму «Словы і іх сэнсы», якое распрацавала студэнтка першага курса Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Ці вось яшчэ адзін прыклад. Дысцыпліна «Матэматыка», тэма «Матэматычныя функцыі ў жыцці чалавека»: *«Функцыя — адно з асноўных і агульнанавуковых паняццяў. Сёння немагчыма ўявіць ніводную навуковую дысцыпліну без апісання зместу з дапамогай розных функцый. Сфармулюйце ў выглядзе функцыянальнай залежнасці: вашу любоў да родных і блізкіх; ваша сяброўства (стасункі) са студэнтамі групы; вашу павагу да старэйшых; вашу любоў да радзімы. Дайце адпаведную аргументацыю».*



**Кіпіць праца над стварэннем эўрыстычных заданняў, якія павінны матываваць студэнтаў да пошуку.**

— У сучаснай вышэйшай і сярэдняй школе важна забяспечыць умовы для самарэалізацыі кожнага навучэнца, даць магчымасць стварыць адукацыйны прадукт, адрозны ад іншых. Трэба памятаць, што **сённяшнія студэнты — гэта заўтрашнія менеджары, і яны павінны быць крэатыўнымі, гнуткімі і мабільнымі,** — падкрэслівае Андрэй Кароль. — Выкладчыкі, якія асвояць курс «Методыка навучання праз адкрыццё...», стануць працаваць па-іншаму, не так, як раней. Гэта будуць не столькі перадатчыкі інфармацыі, колькі менеджары, здольныя выстройваць індывідуальную траекторыю развіцця кожнага студэнта...

«Выконваючы адкрытыя заданні, студэнты перастаюць быць інфармацыйнымі гідамі, яны ступаюць на шлях больш складаных і адказных — пазнання саміх сябе», — так лічыць выпускнік курса.

А вось меркаванні студэнтаў:

«Адкрытыя заданні навучылі мяне складаць уласны план дзеянняў, шырока думаць, выходзіць за рамкі звычайных думак. У заданнях усё было цікава, таямніча, я была сама сабе дэтэктывам, сама расследавала падзеі: што было, а чаго не было».

«Я разважаю, праяўляю фантазію пры выкананні адкрытых заданняў, кантактую на форуме з аднакурснікамі, параўноўваю іх думкі са сваімі ўласнымі. Няўжо гэтага мала? Я ўжо іншая!»

«З дапамогай эўрыстычных заданняў найбольш эфектыўна можа вырашацца, на мой погляд, праблема «заштампаванасці» мыслення. Такія заданні дапамогуць студэнту развіцца, лепш засвоіць інфармацыю і навучыцца прымяняць атрыманыя веды. Галоўнай праблемай пры ўкараненні падобнай формы навучання ў нашых ВНУ, напэўна, будзе нежаданне некаторых выкладчыкаў удасканальвацца і прыкладаць больш намаганняў для таго, каб студэнт не проста зазубрыў, а зразумеў і ведаў, як гэтым у далейшым карыстацца».

Рэктар БДУ Андрэй Кароль лічыць, што ўсё — у руках выкладчыкаў. Ніякая нарматыўная дакументацыя, ніякія загады не ў сілах змяніць сітуацыю ў навучальным працэсе, пакуль канкрэтны чалавек не прыйдзе і не пачне яе змяняць. Менавіта выкладчык можа стварыць матывацыйную «варонку» для студэнта, а на выхадзе мы ўсе атрымаем не проста «нашпігаванага» ведамі выпускніка, а кампетэнтнага крэатыўнага спецыяліста, які будзе адпавядаць патрэбам і эканомікі, і самага прыдзірлівага наймальніка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота прадастаўлена прэс-службай БДУ.**

*Ёсць меркаванне*

# АД ІНФАРМАТЫЎНЫХ — ДА АКТЫЎНЫХ МЕТАДАЎ НАВУЧАННЯ

**«Многія пакаленні вучняў выраслі на зазубрыванні вучэбнага матэрыялу, але тыя, хто крытыкуе ў сувязі з гэтым сучасную школу, не маюць рацыі», — лічыць настаўнік беларускай мовы і літаратуры Баравухскай сярэдняй школы № 15 горада Наваполацка, пераможца Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў «Настаўнік года — 2017» Святлана РУМЯНЦАВА. Сваімі думкамі яна падзялілася з удзельнікамі падагульняючай калегіі Міністэрства адукацыі.**

— Школа імкнецца навучыць дзяцей самастойна здабываць веды, навучыць вучыцца. Новыя праграмы і падручнікі — толькі адна з умоў, але вельмі важная. Мы, настаўнікі, вельмі рады таму, што Міністэрства адукацыі прыслухоўваецца да нашых канкрэтных прапаноў па іх паляпшэнні, заахвочвае да працы над вучэбнымі дапаможнікамі настаўнікаў-практыкаў. І выдатна, што тыя падручнікі, якія паступілі ў школы для вучняў 7 класа, адлюстроўваюць у адзінстве і логіку навукі, і логіку праграмы, і логіку развіцця асобы. Я хоць і з'яўляюся настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, але магу так казаць не толькі пра падручнік па літаратуры, бо водгукі калег (настаўнікаў іншых прадметаў) пацвярджаюць гэта. Новыя падручнікі — інфарматыўныя, наглядныя, яны звязваюць вучэбны матэрыял з дадатковай і сумежнай літаратурай, заахвочваюць да самаадукацыі і творчасці. На Нацыянальным адукацыйным партале ёсць магчымасць пакінуць як крытычныя заўвагі, так і слушныя



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

прапановы па ўдасканаленні падручнікаў. Крытыкуючы — прапануйвай! Калі мы будзем не толькі выказваць сваю незадаволенасць, а пастараемся разам вырашаць праблемныя моманты, то дасягнём вельмі многага.

Лічу, што спасылкі ў базавых падручніках, якія рыхтуюцца зараз, павінны быць не толькі на электронныя рэсурсы Нацыянальнага інстытута адукацыі, але і на распрацоўкі настаўнікаў-метадыстаў, іншых творчых настаўнікаў-практыкаў. Чым больш шырокі будзе банк даных, тым больш якасна будзе засвойвацца абноўлены змест адукацыі.

Вельмі важнай умовай для таго, каб навучыць дзяцей вучыцца, Святлана Румянцава лічыць і пераход ад інфарматыўных да актыўных метадаў навучання, якія ўключаюць элементы праблемнасці, пошуку, шырокае выкарыстанне рэзерваў самастойнай работы вучняў.

«Практыка сведчыць, што выбар тэхналогій на ўроку вызначаецца і наяўнасцю адпаведных сродкаў навучання, і асаблівасцямі вучняў, і часавым рэсурсам, і перавагамі настаўніка. Самым важным крытэрыем выбару, безумоўна, з'яўляецца мэтавая накіраванасць тэхналогіі «Для чаго?». Спашлюся на ўласны досвед: доўгі час вывучала і ўводзіла ў практыку работы тэхналогію развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо, стратэгію актыўнай ацэнкі і магу з упэўненасцю сказаць, што яны дазваляюць максімальна задзейнічаць магчымасці, веды і інтарэсы вучняў для павышэння выніковасці навучальнага працэсу, развіцця інтэлектуальных і творчых здольнасцяў дзіцяці, — зазначыла Святлана Румянцава. — Таксама з уласнага досведу ведаю, што дапамагчы настаўніку ў аваладанні сучаснымі адукацыйнымі тэхналогіямі можа пастаяннае самаўдасканаленне праз самаадукацыю».

— Будучых настаўнікаў трэба рыхтаваць у ВНУ ў практычным ключы, — дадала яна. — Падтрымліваць і дапамагаць ім на пачатку кар'еры. Развіваць на разнастайных метадычных мерапрыемствах. Менавіта тады спалучэнне высокай духоўнасці настаўніка, удасканаленага зместу адукацыі і сучасных адукацыйных тэхналогій дазволяць дасягнуць такой якасці адукацыі, якая будзе адпавядаць патрабаванням беларускага грамадства і дзяржавы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Выпрабавана на сабе*

# ЭКЗАМЕН НА КАНАПЕ

## Як я здавала дыстанцыйнае тэсціраванне

**З гэтага года адзін з этапаў рэпетыцыйнага тэсціравання можна прайсці бясплатна. На сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў даступна дыстанцыйнае РТ па 15 прадметах. Абітурыенту дастаткова ўключыць дома камп'ютар і выканаць заданні ў любы зручны для яго час. Карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай змены» вырашыла апрабаваць новую сістэму і заадно праверыць сябе.**



Любы ахвотны можа бясплатна прайсці дыстанцыйнае тэсціраванне, не выходзячы з дому.

### Лірычнае адступленне

ЦТ я здавала сем гадоў таму. Прычым толькі па адным прадмеце — гісторыі Беларусі. Другім павінна была быць руская мова, але дыплом рэспубліканскай алімпіяды пазбавіў гэтага выпрабавання: мне аўтаматычна паставілі 100 балаў. Чаму я была вельмі рада. Дагэтуль лічу тэсты па мовах, дзе правільных адказаў можа быць некалькі, аднымі з самых складаных.

Да гісторыі я, як і большасць маіх аднакласнікаў, рыхтавалася разам з рэпетытарам. Гэта быў, хутчэй, элемент дысцыпліны: сама б я села паўтараць параграфы за месяц да тэсціравання. А так паслядоўна вывучала прадмет на працягу года. У выніку набрала 92 балы. З парад, якія магу даць тым, хто будзе праходзіць ЦТ: звяртайце ўвагу на інфармацыю пасля параграфаў накшталт «цікава ведаць». І практыкуйцеся рашаць тэсты, бо фактура, якая выкарыстоўваецца для заданняў, у тым ці іншым выглядзе можа паўтарацца.

### Падвёў «сяржант»

Цяпер ужо ад маіх вынікаў нічога не залежыць, але ўсё роўна крыху хвалююся: калі што, у правале давядзецца прызнавацца на ўсю рэдакцыю. Заходжу на сайт Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў і націскаю ўкладку «дыстанцыйнае РТ». Для пачатку выбіраю беларускую мову. Ні пашпартных даных, ні іншай асабістай інфармацыі ўводзіць не патрабуецца. Раздрукоўваю бланк з заданнямі і пачынаю. Па шчырасці, у школе гэты прадмет даваўся мне не надта лёгка. Але дзясяткі кніг айчынных пісьменнікаў, прачытаныя падчас вучобы ва ўніверсітэце, і асабліва работа ў беларускамоўнай газеце далі свой плён. Правапіс большасці слоў не выклікае пытанняў: «менеджараў» успамінаю з матэрыялаў пра рынак працы, «шарсцяныя» вырабы — з аглядаў тыдняў моды. Складанасці ўзнікаюць, калі пачынаюцца заданні пра будову сказа. Вызначыць выказнік, адрозніць пабочныя канструкцыі ад устаўных... Усё ж такі пры напісанні артыкулаў і рэпартажаў гэтай інфармацыяй не карыстаешся.

На тэст адводзіцца дзве гадзіны, але я спраўляюся за 44 хвіліны. Пераношу адказы ў электронны бланк. Умовы яго запаўнення вельмі набліжаныя да рэальных. Так, калі вы паставілі крыжык не ў тым слупку, выдаліць яго звычайным націскам мышкі нельга. Як і ў папяровым варыянце, адмяняць памылковую метку трэба будзе ў асобнай графе. У частцы А можна выправіць шэсць адказаў, у частцы В — два.

Націскаю на кнопку, каб разлічыць вынік. 79 балаў! Мне здаецца, нядрэнна, тым больш што я спецыяльна не рыхтавалася. Тут жа можна ўбачыць, у якіх пытаннях ты дапусціў памылкі, і паглядзець правільныя адказы са спасылкай на параграф у падручніку. Я, напрыклад, забылася, што зваротак не з'яўляецца членам сказа, а слова «сяржант» не адносіцца да тых выключэнняў, дзе ў першым складзе перад націскам захоўваецца літара «е».

### Увага ніколі не лішняя

Натхнёўшыся, бяруся за тэст па гісторыі Беларусі. На тое, каб выканаць 50 заданняў, у мяне ёсць паўтары гадзіны. Чытаю пытанні і разумею, што ў памяці мала што захавалася. Таму часцей падключаю не веды, а логіку. Прасцей спраўляцца з заданнямі, дзе трэба адзначыць тэндэнцыі і рысы, характэрныя для пэўнага часу, прычыны падзей, а не назваць канкрэтныя даты і дакументы (вось вы памятаеце, што такое Генрыхавы артыкулы?).

Заканчваю праз гадзіну. Вынік — 50 балаў... Ну, што сказаць? Мой рэпетытар быў бы расчараваны. Аналізую памылкі. Некаторых магла б пазбегнуць, калі б чытала ўмовы заданняў больш уважліва. Дарэчы, у версе бланка напісана слушная рэкамендацыя — адказваць на пытанні па чарзе. Узнаўляць ход падзей у храналагічным парадку прасцей, чым «скакаць» з адной эпохі ў іншую.

Праверыць свае школьныя веды вырашыў і мой муж. Ён праходзіў тэст па сусветнай гісторыі. Набраў 55 балаў — усяго на чатыры менш, чым пры паступленні ва ўніверсітэт 11 гадоў таму. Праўда, сам муж быў незадаволены: спадзяваўся, што падчас вучобы ў ВНУ павысіў свой узровень ведаў.

### Замест вынікаў

Дыстанцыйнае тэсціраванне — добры спосаб для абітурыента азнаёміцца з тым, што сабой уяўляе гэты від уступнага экзамену. Але, на маю думку, не трэба абмяжоўвацца толькі ім. Варта хоць бы раз пабываць на класічным рэпетыцыйным тэсціраванні. Усё ж такі адказваць на пытанні ў дамашняй абстаноўцы за кубкам гарбаты і ў аўдыторыі побач з іншымі выпускнікамі — розныя рэчы. Дый запісваць адказы капрызнай гелевай ручкай складаней, чым уводзіць іх на камп'ютары.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

### ВАЖНАСЦЬ «РАЗВЕДКІ БОЕМ»

**У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў заўважылі, што ў абітурыентаў, якія прымаюць удзел ва ўсіх этапах рэпетыцыйнага тэсціравання, вынікі, як правіла, на 10—15 балаў вышэйшыя, чым у тых, хто ігнаруе такую магчымасць.**

Поспех на экзамене залежыць ад многіх фактараў. Псіхалагічна да тэставай формы ўступных іспытаў усе ўжо даўно прызвычаіліся, а вось тэхнічная адаптацыя патрабуецца кожнаму новаму пакаленню абітурыентаў. Да рэпетыцыйнага тэсціравання трэба ставіцца ў першую чаргу як да выдатнага сродку самадыягностыкі і адпрацоўкі тэставых тэхналогій.

Для непадрыхтаванага чалавека гэта цэлая навука — як правільна ўносіць у клетачкі адзінкі вымярэння (градусы, працэнты, метры, тоны), лічбавыя адказы ў выглядзе дробу, сімвалы хімічных элементаў або адказ, які складаецца з двух слоў. Незразумела, у якім склоне даваць адказ на пастаўленае пытанне. А цяпер уявіце сабе, што рабіць гэта даводзіцца ў стрэсавай абстаноўцы сапраўднага экзамену, ад выніку якога залежыць, ні больш ні менш, ваша прафесійная будучыня. Задумвацца над «дробнымі» тэхнічнымі момантамі зусім няма часу, бо гадзіннік няўмольна адлічвае хвіліны, што засталіся да заканчэння выпрабавання...

У адрозненне ад цэнтралізаванага, на рэпетыцыйнае тэсціраванне могуць трапіць не толькі абітурыенты, але і дзесяцікласнікі, і бацькі школьнікаў, і настаўнікі, і рэпетытары. Яны могуць прыйсці ва ўніверсітэцкую аўдыторыю, каб на ўласным вопыце пераканацца, ці так проста згуляць ва «ўгадайку» і метадам выпадковага выбару адказаў набраць прыстойную суму балаў. Бо адна справа — разважаць у тэорыі, і зусім іншая — прайсці ўвесь тэст ад «А» да «Я» за строга лімітаваны час.

Зараз у краіне праходзіць другі этап платнага рэпетыцыйнага тэсціравання. А ў сакавіку стартуе трэці. Ён, як правіла, прыцягвае найбольшую ўвагу абітурыентаў, паколькі вясной засвоена ўжо ўся школьная праграма і гэта самы зручны час, каб здзейсніць «разведку боем». Між іншым, кожная новая «рэпетыцыя» экзамену — гэта спосаб яшчэ раз сябе праверыць. Можна спыніцца і на адной спробе, але толькі трапіўшы ў вузаўскую аўдыторыю, атрымліваеш шанц цалкам паглыбіцца ў атмасферу будучага выпрабавання...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*І так бывае...*

# Не памыліцца з выбарам ВНУ, або Спроба нумар два

**Любы стралок пацвердзіць, што пацэліць у цэнтр мішэні неверагодна складана. Што ўжо казаць пра абітурыентаў: у іх ёсць толькі адзін шанц зрабіць «выстрал» — падаць дакументы ў тую навучальную ўстанову, дзе сапраўды будзеш адчуваць сябе на сваім месцы. А калі ўсё ж такі «прамахнешся»? «Галоўнае — не адчайвацца!» — раяць тыя, хто вырашыў змяніць ВНУ і ўсё ж такі трапіў у цэль, няхай сабе і з другой спробы.**

**Ульяна МАСАЛОВІЧ, студэнтка ІІ курса факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ (папярэдняе месца вучобы — юрыдычны факультэт Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО»):**

— Першапачаткова я выбрала юрыдычны факультэт таму, што заўсёды лічыла сябе змагаром за справядлівасць, хацела адстойваць правы тых, хто не можа гэтага зрабіць самастойна. Прываблівалі таксама будучая праца ў міжнароднай арганізацыі і магчымасць вывучаць замежныя мовы.

Але, калі ва ўніверсітэце пачаліся профільныя дысцыпліны, я зразумела, што мне гэта нецікава. Цяжка было пераносіць заняткі, увесь час хацелася ўцячы. У нейкі момант я цвёрда вырашыла: гэта больш працягвацца не можа! Неяк раніцай я проста прыйшла ва ўніверсітэт і напісала заяву аб адлічэнні.

Мама падтрымала мой выбар, але іншыя блізкія мне людзі вельмі здзівіліся, я часта чула: «Навошта? Пацярпела б да трэцяга курса, а потым бы прызвычаілася». Але мне было ўсё роўна, што казаў: далей жа мне жыць з гэтай прафесіяй, а не ім.

Зараз я задаволена ўсім: і прадметамі, і выкладчыкамі, і калектывам. Зусім не шкадую, што ў мяне быў такі вопыт, таму што цяпер я па-іншаму гляджу на многія рэчы. Лічу, што не варта дарма «сядзець» ва ўніверсітэце толькі таму, што «так хоча мама». Яна за вас вучыцца не будзе і працаваць таксама. Важна думаць сваёй галавой і вырашаць: твой парыў сысці — гэта хвілінны капрыз або цвёрдая ўстаноўка.

**Галіна ВЫСОЦКАЯ, студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ (папярэдняе месца вучобы — філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы):**

— У школе я ўдзельнічала ў алімпіядах па рускай мове, хацелася вывучаць гэты прадмет больш глыбока, таму паступіла на філалагічны факультэт. Змяніць месца вучобы я вырашыла пасля першай сесіі. Шукаць іншую ВНУ доўга не прыйшлося, бо Інстытут журналістыкі я разглядала для паступлення яшчэ ў дзясятым класе. Адразу пасля прыняцця рашэння аб змене ВНУ зноў пачала падрыхтоўку да ЦТ, пісала журналісцкія матэрыялы для ўнутранага ўступнага экзамену «Творчасць», паралельна працягваючы вучыцца на філфаку.

Сябры, калі даведаліся аб маіх намерах, хоць і перажывалі, але падтрымлівалі. Бацькі першы час баяліся, што я страчу бюджэтнае месца ў Гродне і не прайду на бясплатнае ў Мінску. Але яны прывыклі, што я даўно стала самастойным чалавекам, таму паважалі мой выбар.

Толькі на журфаку я адчула сябе на сваім месцы. Ні разу не пашкадавала аб такім выбары. Ён быў правільным! Я знайшла шмат новых сяброў і стала членам дружнай сям'і! Упэўнена, што чалавек — сам творца свайго жыцця. Вучоба, якая не прыносіць задавальнення, раўнацэнная нелюбімай працы. Ці варта марнаваць на яе свой час?

**Кацярына КУРЛОВІЧ, студэнтка ІІІ курса факультэта псіхалогіі ГрДУ, інструктар трэнажорнай залы (папярэдняе месца вучобы — медыка-псіхалагічны факультэт ГрДМУ):**

— Урачом хацела стаць яшчэ з дзяцінства. Але ў старшых класах пачала займацца ў трэнажорнай зале і ў мяне з'явілася ідэя стаць трэнерам. Бацькі адгаварылі ад гэтай задумы, ды і па стане здароўя ў БДУФК прайсці я не магла. Так і паступіла ў медыцынскі.

Ужо на першым курсе сталі вяртацца думкі пра трэнерства, але я разумела, што ў любым выпадку трэба атрымаць добрую адукацыю, тым больш я вучылася на бюджэце.

Аднак праз год пераканалася, што прафесія ўрача — не маё, трэба было тэрмінова нешта мяняць. Я стала падпрацоўваць афіцыянткай і адначасова шукаць работу ў сферы фітнесу. Запісалася на курсы інструктараў трэнажорнай залы і пайшла ў акадэмічны водпуск. Усвядоміўшы, што фітнес — гэта тая сфера, дзе я адчуваю сябе шчаслівай, у медыцынскі ўжо не вярнулася.

Любімая праца ў мяне з'явілася, а акадэмічны водпуск заканчваўся, таму трэба было нешта вырашаць з вышэйшай адукацыяй. Мой выбар выпаў на факультэт псіхалогіі ГрДУ. Не ўпэўнена, што буду працаваць па спецыяльнасці, але псіхалогіяй я захапляюся даўно, таму зараз вельмі задаволеная.

Бацькі былі супраць змены ўніверсітэта, мне прыйшлося перажыць шмат канфліктных размоў. Але цяпер яны за мяне радыя і ганарацца, што тады я настаяла на сваім.

Усім, хто сутыкнуўся з падобнай сітуацыяй, хачу параіць не спяшацца і разабрацца ў сабе. Калі студэнт дакладна ведае, чаго ён хоча, то няхай дзейнічае! Не трэба баяцца перамен, трэба імкнуцца быць шчаслівым!

**Ганна ЯЎСЕЙЧЫК, студэнтка ІІІ курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
15 02 2018 г.

*У ліку найлепшых*

# ШТО ВЫ ЯШЧЭ НЕ ВЕДАЛІ ПРА... КРОП?

**Услед за іншымі рэгіёнамі ўдзельнікі мінскага адборачнага тура конкурсу «100 ідэй для Беларусі» прэзентавалі паўсотні новых распрацовак у галіне аграпрамысловых тэхналогій і вытворчасці, медыцыны і фармацыі, архітэктуры, бія- і нанаіндустрыі, IT-тэхналогій, абароны ад надзвычайных сітуацый, сацыяльнай сферы. Сярод аўтараў праектаў — навучэнцы сталічных школ, гімназій і каледжаў, а таксама студэнты і працоўная моладзь.**

Напрыклад, у экспазіцыі выстаўкі-прэзентацыі была прадстаўлена электронная гульня «SmartyCount» навучэнцаў Мінскага радыётэхнічнага каледжа Кірыла Шчэрбы і Данііла Кузьмінава, якая дапамагае развіваць у дзяцей уважлівасць, уседлівасць, памяць, уменне добра і хутка лічыць. Не менш важна і тое, што гэтая гульня дазваляе бацькам і педагогам кантраляваць узровень развіцця дзяцей.

Вучаніца сталічнай СШ № 101 Дар'я Чапрасава прэзентавала праект прыродазнаўча-навуковага напрамку «Вылучэнне і вывучэнне якаснага і колькаснага складу эфірнага алею кропу еўрапейскага». Перапрацоўка мясцовай эфіраалейнай сыравіны, атрыманне эфірных алеяў можа прымяняцца ў вытворчасці парфумерна-касметычнай прадукцыі.

Уладзіслаў Аніскавец і Мікалай Скоўпень — навучэнцы мінскага Ліцэя № 1 — прадставілі мабільную праграму «Вучы-гуляй» для дзяцей. Інфармацыя ў гульнявой форме лягчэй успрымаецца і надоўга застаецца ў памяці. Студэнт БНТУ Яўген Вяршыла прэзентаваў праект «Біянічная рука» ў сферы фарм- і біятэхналогій. Біянічная рука зроблена з пластыку, алюмініевых уставак і гумы. Яе можна «падагнаць» пад канкрэтнага чалавека, адсканаваўшы адбітак здаровай рукі. Мадэль будзе каштаваць значна менш у параўнанні з замежнымі аналагамі.

Студэнты БДУІР Сяргей Краўцоў і Мікалай Ляшкевіч прэзентавалі аўтарскі праект пад назвай «Бескантактавыя вагі». Распрацоўка дазваляе пры дапамозе здымкі на мабільны тэлефон або планшэт стварыць трохмерную мадэль сельскагаспадарчай жывёлы, а затым прааналізаваць яе і вылічыць яе аб'ём і плошчу паверхні.

У намінацыі «Нацыянальная бяспека і абараназдольнасць, абарона ад надзвычайных сітуацый» распрацоўку «Трэнажор для тактычнай падрыхтоўкі членаў камісіі па надзвычайных сітуацыях» прадставіў студэнт Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Сяргей Бордак. Праграмнае забеспячэнне дапамагае выпрацаваць навыкі прыняцця правільных кіраўніцкіх рашэнняў ва ўмовах надзвычайных сітуацый і знізіць паказчыкі траўматызму і гібелі людзей.

Па выніках гарадской выстаўкі аўтары 20 найлепшых праектаў атрымалі магчымасць прадставіць свае распрацоўкі ў рэспубліканскім этапе «100 ідэй для Беларусі». А ўсе ўдзельнікі прэзентацыі былі адзначаны сертыфікатамі Мінскага гарадскога камітэта БРСМ.

Нагадаем, у гэтым годзе выстаўка маладзёжных інавацыйных праектаў «100 ідэй для Беларусі» праводзіцца ў трох катэгорыях: у першай канкурыруюць навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі; у другой — студэнты, курсанты, слухачы ўстаноў вышэйшай адукацыі; і ў трэцяй — маладая навукоўцы да 35 гадоў, працуючая моладзь. Пераможцы выбіраюцца ў 20 намінацыях.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Актыўная пазіцыя*

# ЗРАБІ СВАЁ ФОТА НА ВЫБАРЧЫМ УЧАСТКУ!




**Мінская гарадская арганізацыя БРСМ прэзентавала конкурс сэлфі «Моладзь_выбірае». Яго галоўнай мэтай з'яўляецца павышэнне электаральнай актыўнасці хлопцаў і дзяўчат, прыняць удзел у ім зможа кожны малады выбаршчык. Для гэтага па 18 лютага неабходна зрабіць сэлфі на выбарчым участку і размясціць яго ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» з хэштэгамі #Молодежь_выбирает, #Выборы2018. З 19 па 21 лютага ў афіцыйнай групе Мінскай гарадской арганізацыі саюза моладзі «УКантакце» пройдзе адкрытае галасаванне на самае лепшае фота акцыі. Пераможцы, а таксама найлепшыя 50 работ будуць адзначаны сувенірамі.**

Нагадаем, што па ініцыятыве Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ ва ўсіх рэгіёнах краіны рэалізуецца акцыя «#Моладзь вырашае!», прымеркаваная да правядзення выбараў, падчас якой кожны ахвотны выбаршчык можа напісаць патэнцыйным дэпутатам пажаданні, апусціўшы іх у спецыяльныя скрыні, устаноўленыя ў месцах правядзення пікетаў БРСМ у падтрымку кандыдатаў у дэпутаты, а таксама ў час маладзёжных акцый, прысвечаных выбарам. Акрамя таго, гэтай арганізацыі належыць ініцыятыва па стварэнні і запуску мабільнай праграмы «Галасую» ў дапамогу выбаршчыкам.

Таксама ў дні датэрміновага галасавання і ў дзень выбараў валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» акажуць дапамогу ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і інвалідам у іх суправаджэнні на выбарчыя ўчасткі. Усяго плануецца задзейнічаць каля тысячы добраахвотнікаў. Пры Мінскай гарадской арганізацыі саюза моладзі працуе гарачая лінія (284 85 54), куды можа звярнуцца і пакінуць заяўку той, хто мае патрэбу ў дапамозе.

Нядаўна прайшлі трэнінгі з удзелам каля ста прадстаўнікоў валанцёрскага руху БРСМ «Добрае Сэрца», на якім працягнулася навучанне добраахвотнікаў неабходным навыкам аказання дапамогі маламабільным выбаршчыкам у перыяд работы выбарчых участкаў у сталіцы падчас выбараў дэпутатаў у Мінгарсавет. У праграму практычных заняткаў былі ўключаны трэнінгі па этыцы стасункаў, майстар-класы з невідушчымі людзьмі і Беларускага таварыства інвалідаў.

На 18 лютага з 9.00 да 21.00 будзе працягнутая работа штаба Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ па ўдзеле моладзі ў выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў 28-га склікання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «Надзея» дорыць усмешкі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

На думку ўдзельнікаў «Надзеі», усе людзі могуць рабіць дабро. Проста не ўсе пра гэта ведаюць. Таму адна з задач валанцёра — нагадаць. У чацвёртай школе дабрачынныя акцыі сярод саміх школьнікаў праводзяцца ледзь не кожны тыдзень. Валанцёры заклікаюць то пакарміць бяздомных катоў і сабак, то зрабіць кармушку для птушак, а то і проста намаляваць паштоўку з прыемнымі пажаданнямі і падарыць яе выпадковым мінакам. Падчас акцый «Дзеці — дзецям» і «Дарогаю дабра» ў холе школы адбываецца збор цацак, канцтавараў, вопраткі і абутку ў добрым стане і іншых рэчаў. Так да валанцёрскага руху далучаюцца абсалютна ўсе вучні. «Піянерскі пакой у перадсвяточныя дні падобны на майстэрню Дзеда Мароза — столькі ў нас там падарункаў збіраецца», — кажа Юлія Богуш. На яе думку, гэта тыя самыя дробязі, ад якіх наш свет становіцца лепшым.

Разам з тым добрыя справы «Надзеі» даўно выйшлі за межы школы. Хлопцы і дзяўчаты супрацоўнічаюць з раённым камітэтам БРСМ, РАУС, тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання.

— Два разы на год мы арганізоўваем вялікі збор сродкаў на падарункі да свят для дзяцей-інвалідаў, сірот. Вядома, што самі мы грошы не зарабляем, таму па дапамогу звяртаемся ў розныя арганізацыі і прадпрыемствы горада. Прыйсці куды-небудзь прасіць у людзей грошы на дабрачыннасць — задача не з лёгкіх нават для дарослых валанцёраў. Да таго ж, калі ты школьнік, заўсёды ёсць імавернасць, што да цябе і тваіх слоў паставяцца несур'ёзна. Таму нас у такіх выпадках выратоўвае дакумент з подпісамі і пячаццю, дзе пазначана, хто мы такія і навошта збіраем сродкі, — расказвае адзінаццацікласніца Юлія Цяльпук.

Падтрымку дарослых юныя валанцёры адчуваюць на ўсіх этапах сваёй працы. Сёлета падчас навагодніх дабрачынных акцый ролю Дзеда Мароза выканаў сам дырэктар чацвёртай школы, а Снягуркай была сацыяльны педагог.

Цікава, што сваёй дзейнасцю вучні-валанцёры чацвёртай школы імкнуцца ахапіць не толькі родны Лунінец, яны ўжо неаднаразова прымалі ўдзел у абласных дабрачынных акцыях.

— Мы сабралі падарункаў для дзяцей больш, чым было трэба. Доўга не думаючы, завезлі іх у Брэст — там яны хутка знайшлі сваіх уладальнікаў. У валанцёрскай справе лішкаў ніколі не бывае! — кажа куратар атрада.

Большасць акцый, якія праводзяць валанцёры, прымеркаваныя да свят і памятных дат. Аднак самым вялікім і адказным праектам «Надзеі» стала дабрачынная мерапрыемства ў падтрымку маладой лунінчанкі Марыны Грушэўскай. Сумесна з аддзелам адукацыі, спорту і турызму райвыканкама школьнікі арганізавалі вялікі канцэрт, конкурсы, бяспройгрышную латарэю, аўкцыён для таго, каб сабраць грошы на медыцынскае абследаванне сур'ёзна хворай жанчыны. Усё атрымалася — сваёй мэты валанцёры з чацвёртай школы дасягнулі. І ўжо ставяць перад сабой новыя.



У планах — наладзіць кантакты з бальніцай. Там валанцёрская дапамога таксама патрэбная.

Гледзячы на ўдзельнікаў атрада, дзіву даешся, як яны паспяваюць рабіць столькі ўсяго.

— Не сакрэт, што вучоба для адзінаццацікласнікаў — на першым месцы. Але нельга быць зацыкленымі толькі на ўроках і падрыхтоўцы да экзаменаў і ЦТ. А валанцёрства дапамагае «разгрузіць» галаву: гэта занятак, які патрабуе ад цябе поўнай эмацыянальнай аддачы. Асабліва калі ты працуеш з інвалідамі або дзеткамі-сіротамі, — расказвае вучань 11 «Б» класа Вадзім Колбік.

— З іншага боку, валанцёрства дае шанц праявіць свае творчыя здольнасці, — працягвае думку аднакласніка Аляксандр Крэменеўскі. — Хтосьці добра іграе на сцэне — яму дадуць ролю ў пастаноўцы ці прызначаць вядучым на канцэрце. Хтосьці малюе — тады будзе афармляць афішы ці праводзіць майстар-класы. Пры гэтым многія ў нас маюць арганізатарскія здольнасці, умеюць весці гутарку з абсалютна рознымі людзьмі.

«Надзея» — адзіны ў раёне валанцёрскі атрад з такой маштабнай дзейнасцю. Таму не дзіўна, што менавіта яны сталі найлепшымі ў сваёй намінацыі на рэспубліканскім конкурсе «Валанцёр года — Добрае Сэрца». Журы конкурсу — кіраўніцтва БРСМ — лунінчане скарылі фірмавай «фокусатэрапіяй».

— Мы часта працуем з дзеткамі з асаблівасцямі развіцця. Перад пачаткам любога мерапрыемства праводзім так званую фокусатэрапію, якая здымае напружанне і дазваляе наладзіць кантакт з маленькімі і не зусім звычайнымі гледачамі. 15-хвілінная праграма, дзе мы паказваем «спрытнасць рук і ніякай магіі», заўсёды ўспрымаецца на ўра і працуе на ўсе сто працэнтаў, — расказалі валанцёры.

**Ганна КУРАК.**

*Мінск — Лунінец — Мінск.*

*Эпіцэнтр ініцыятыў*

# СТАТУС АБАВЯЗВАЕ!

## У Магілёве моладзь дэманстравала свае дасягненні

**Прымерацы на сябе званне «Маладзёжная сталіца — 2018» Магілёву дапамагла перш за ўсё актыўная пазіцыя тутэйшай моладзі — іх дасягненні ў спорце, вучобе, ініцыятыўнасці.**

Падчас афіцыйнага пасвячэння горада ў гэты статус міністр адукацыі Ігар Карпенка адзначыў, што Магілёўшчына сёння вельмі дынамічна развіваецца, тут жыве шмат цікавай і творчай моладзі, якая вельмі паспяхова рэалізуе прапісаную ў дзяржаўных праграмах палітыку. Новы статус, на яго думку, стане моцным стымулам для яшчэ больш актыўнага прасоўвання маладзёжных ініцыятыў, творчых праектаў, перадавых ідэй. Ініцыятыўныя і вынаходлівыя, творчыя і цікаўныя, захопленыя і натхнёныя, упартыя і амбіцыйныя — менавіта яны сталі героямі свята. На выстаўцы ў абласным цэнтры творчасці, прысвечанай святу «Магілёў — маладзёжная сталіца», прадставілі магілёўскіх ВНУ і іншых устаноў адукацыі дэманстравалі свае дасягненні, дзяліліся планамі і ўражаннямі.

Навучэнка Магілёўскага тэхналагічнага каледжа Настасся Данілава прадстаўляла сваю ўстанову ў фінальным этапе чэмпіянату WorldSkills у Краснадары. Гэта падзея, прызнаецца яна, цалкам перамяніла яе мысленне аб кулінарыі. Яна ўбачыла, наколькі творча і натхнёна можна працаваць.

Інжынер-даследчык Бабруйскага прадпрыемства «Белшына» Максім Шаўцоў дэманстраваў на выстаўцы 3D-прынтар, з дапамогай якога можна рабіць аб'ёмныя рэчы. Былы выпускнік магілёўскага Беларуска-Расійскага ўніверсітэта два гады таму стварыў у Бабруйску Цэнтр інавацыйнай маладзёжнай творчасці, каб выхоўваць будучых прасунутых інжынераў. Зараз яго з задавальненнем наведваюць 23 чалавекі. Гэта школьнікі, улюбёныя ў матэматыку і геаметрыю, мадэляванне на 3D-прынтары дапамагае ім добра падрыхтаваць сябе да інавацыйнай дзейнасці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*Свой стыль*

# НЕФАРМАТНЫ ПОДЫУМ,

## або Насуперак стандартам

**Пакрытыя яскравымі татушкамі рукі, тунэлі і пірсінг, каляровыя валасы і кідкі макіяж — ці такім вы ўяўляеце сучасны мадэлінг? Але чаму не кінуць выклік старым надакучлівым стандартам і не вывесці на подыум людзей з нефарматнай знешнасцю?**
**У Беларусі з'явілася першае альтэрнатыўнае мадэльнае агенцтва B.O.O.M. (Breaking of old memories), гэта каманда сапраўды ламае стэрэатыпы і ўяўленні пра свет прыгажосці. Хлопцы і дзяўчаты з «хуліганскай» знешнасцю скараюць дызайнераў, «упісваюцца» ў рэкламу разнастайных рэчаў — ад спартыўнага інвентару да ўпрыгажэнняў і вясельных сукенак, заражаюць пазітывам на мерапрыемствах, удзельнічаюць у самых адметных і крэатыўных тусоўках.**



— Калі ўсе мадэлі аднолькавыя — гэта нецікава, а людзі з нестандартнай знешнасцю заўсёды запамінаюцца. Татуіроўкі, пірсінг ці, напрыклад, зялёныя валасы могуць камусьці спадабацца, а некаму — наадварот, але ўсё роўна такая мадэль прыцягвае ўвагу, — заўважае **кіраўнік мадэльнага агенцтва Ірына БАБАРЭКА.** — Так, калі я была на міжнародным форуме прадпрымальніцтва, адзін з замежных спікераў адзначыў мой колер валасоў і зрабіў камплімент. На Захадзе людзі з татуіроўкамі ўжо нікога не шакіруюць, там гэта звычайная з'ява. А да нас мода на тату толькі зараз прыходзіць.

**Апошнім часам усё большую цікаўнасць выклікаюць незвычайныя тыпажы, а альтэрнатыўны мадэлінг якраз аб'ядноўвае людзей з самабытнай, запамінальнай знешнасцю.**

Між іншым, агенцтва Ірына адкрывала ў свой дзень нараджэння, калі ёй спаўняўся 21 год, а да таго паспела змяніць некалькі месцаў працы. Прычым зарабляць грошы дзяўчына пачала з 14 гадоў.

— З такога ўзросту падлеткі ўжо могуць афіцыйна працаваць. Я была ў дзіцячым доме, і для сірот гэта магчымасць зарабіць на марожанае. Мы былі падсобнымі рабочымі і атрымлівалі капейкі, але любы занятак — гэта вопыт. Я доўга шукала сябе. Атрымала будаўнічую спецыяльнасць. Але, калі працавала будаўніком, мулярам ці менеджэрам у друкарні, не бачыла для сябе перспектыў, — дзеліцца дзяўчына. — Тады надумала звольніцца і — будзь што будзе. На той час я мела вопыт здымак, прадстаўляла расійскае мадэльнае агенцтва, у вольны час займалася арганізацыяй здымак для яго. І мне падалося, што гэта крутая ідэя — стварыць у Беларусі новы праект для татуіраваных мадэляў.



Насамрэч пачаць сваю справу — не так складана, як падаецца, і не так многа фінансаў патрабуецца. На рэкламу наогул не трацілася, пастаянна кантактавала з журналістамі, спачатку пісала сама. Паступова пачала стварацца каманда. Амаль год я практычна бясплатна працавала на сваіх мадэляў, дапамагала ім развівацца, арганізоўвала здымкі, унёсак рабілі і самі хлопцы і дзяўчаты. Хтосьці дапамагаў ствараць дызайн афіш мерапрыемстваў, нехта ўмеў наносіць макіяж, здымаць...

Звычайна, калі людзі прыходзяць у агенцтва, яны плацяць за здымкі, майстар-класы, навучанне. Каб пачаць працаваць мадэллю ў B.O.O.M., плаціць не трэба. Ды і навучанне там выключна практычнае — замест сумных майстар-класаў агенцтва арганізоўвае фотаздымкі, на якіх людзі спрабуюць сябе ў розных вобразах, разнявольваюцца, перастаюць баяцца камер. І ўсе стараюцца. Тыя ж, хто да справы ставіцца несур'ёзна, вылятаюць з каманды. У нас ёсць сістэма балаў, якія мадэлі атрымліваюць за здымкі, удзел у мерапрыемствах і нават за рэпосты агенцтва. Хто набраў больш за астатніх, заахвочваецца падарункамі ад партнёраў — дызайнераў і крам. Дарэчы, першым падарункам, калі сістэма толькі ўводзілася, была бясплатная татуіроўка, за яе вялася цэлая «вайна». Пад канец месяца я заўсёды заўважаю максімальную актыўнасць — усе думаюць, як зарабіць балы і трапіць у спіс прызёраў. У той жа час той, хто правініўся, — караецца. Балы зніжаюцца нават за грубыя словы, — дзеліцца Ірына.

Трэба сказаць, што B.O.O.M. дае магчымасць рэалізавацца людзям, для якіх закрыты класічны мадэлінг. Так, у не вельмі высокіх мадэляў шанцаў трапіць на подыум няма, але ў альтэрнатыўным агенцтве хлопцы і дзяўчаты могуць быць задзейнічаны ў фотаздымках. Апошнім часам усё большую цікаўнасць выклікаюць незвычайныя тыпажы, а альтэрнатыўны мадэлінг якраз аб'ядноўвае людзей з самабытнай, запамінальнай знешнасцю. Больш за тое, з такімі асобамі любяць працаваць стылісты і візажысты, бо з імі можна ўвасабляць самыя неверагодныя ідэі, экстравагантна іх апранаць, эксперыментаваць з макіяжам.

— Калі звычайнаму чалавеку зрабіць зялёныя вочы і, напрыклад, жоўтыя вусны, гэта можа выглядаць і непрыгожа, і недарэчна. Калі ж у мадэлі каляровыя валасы і цела пакрыта татуіроўкамі, можна спалучаць разнастайныя колеры і гэта будзе выглядаць гарманічна, — заўважае Ірына. — Але мы не раім рабіць татуіроўкі толькі для таго, каб трапіць да нас у агенцтва. Не факт, што чалавеку спадабаецца праца мадэлі, а са знешнасцю, якая яму, магчыма, і не падабаецца, ён застанецца і будзе вымушаны змірыцца.

— Змена знешнасці можа ўплываць на жыццё чалавека. Што набывае той, хто робіць такі крок?

— Я — працу, хобі, сям'ю, сяброў, змагла сабраць добрую каманду — цудоўны калектыў з людзей, якім давяраю і якімі ганаруся. Маіх мадэляў друкуюць у глянцавых часопісах, запрашаюць на здымкі, імі цікавяцца. У нас з'явіліся фанаты, хлопцаў і дзяўчат пазнаюць на вуліцы, падтрымліваюць. Нават погляды на жыццё змяніліся, я з цікавасцю гляджу на свет, мне падабаецца разглядаць мінакоў. Так, заўважаю, што апошнім часам стала больш рознакаляровых людзей, з жоўтымі, зялёнымі валасамі; сустракала і дзяўчат, у якіх нават па колерах афарбоўка падобная на маю: палова галавы ў бірузовым, палова ў ружовым колеры. Усё менш становіцца непаразуменняў, хаця негатыву і зараз яшчэ хапае...

У Беларусі пакуль яшчэ не ўсе гатовы адэкватна ўспрымаць эксперыменты са знешнасцю. Часам нефарматная моладзь можа пачуць у свой бок непрыемныя словы. Існуюць і стэрэатыпы, што людзі з татуіроўкамі на руках ці тунэлямі ў вушах — амаль асацыяльныя элементы. Ірына ўспомніла, як да яе ў транспарце прывязаўся нецвярозы чалавек: «Адкажы за свае наколкі», але колькі дзяўчына ні спрабавала растлумачыць, што гэта «мастацкая татуіроўка» і яна не мае ніякага дачынення да турэмнай сімволікі, адвязацца ад хама было цяжка. Насамрэч прымяраць на сябе яскравыя вобразы могуць і вельмі сціплыя, спакойныя людзі. Мадэлі альтэрнатыўнага агенцтва атрымліваюць вышэйшую адукацыю ці ўжо працуюць юрыстамі, эканамістамі, занятыя на розных важных, «сур'ёзных» пасадах. І часта на асноўным працоўным месцы ім даводзіцца забывацца на свае густы — хаваць татуіроўкі пад доўгімі рукавамі, не рабіць «узрыўны» макіяж. Затое на здымках моладзь кайфуе, адрываецца па поўнай. Дарэчы, іх каляровы лад жыцця прадстаўлены ў інтэрнэце.

— У нас з'явілася ідэя стварыць відэаблогі (яны выкладваюцца ў нашай групе «УКантакце» і на YouTube) і суправаджаць іх міні-інтэрв'ю. Мы нічога не хаваем. Людзі могуць назіраць за працай мадэляў, бачыць, як праходзяць здымкі, больш даведацца пра агенцтва, нашых хлопцаў і дзяўчат. Часам на фатаграфіі мадэлі могуць выглядаць агрэсіўнымі, а ў жыцці яны адкрытыя, мілыя, пазітыўныя, — далучаецца да размовы **галоўны памочнік Ірыны Юрый ВАНКЕВІЧ.** — Вы заўважыце, якія розныя ідэі можна раскручваць з нашай камандай, любы тавар можна абыграць у фотапраекце ці відэарэкламе. Прычым з альтэрнатыўнымі мадэлямі зрабіць гэта можна прыгожа і яскрава. Праз вобраз, фота можна падаваць інфармацыю (напрыклад, мы малявалі на тварах сцягі і здымаліся з нацыянальнымі стравамі розных краін). А чаму б не закрануць сацыяльную тэматыку? Так, мы рабілі сумесныя здымкі бацькоў і дзяцей — праект пра ўзаемаадносіны ў сям'і.

— У першую чаргу хацелася сказаць, каб бацькі паважалі інтарэсы дзяцей, — дадае Ірына. — Лепш няхай дзіця эксперыментуе з колерам валасоў, чым ужывае наркотыкі ці яшчэ штосьці. Калі падлетак загарэўся ідэяй па змене знешнасці, ён усё роўна зробіць татуіроўку, магчыма, недзе падпольна, дрэнную, крывую. Важна, каб у сям'і было паразуменне, нічога не ўтойвалася.

Дарэчы, у планах агенцтва — стварыць такую прастору, куды змогуць звяртацца людзі рознага ўзросту, у тым ліку дзеці і састарэлыя, і пры жаданні кожны зможа паспрабаваць сябе ў ролі мадэлі. Некаторыя ідэі Ірына пакуль трымае ў сакрэце, але падзялілася, што ў найбліжэйшы час (да таго, як выйдзе ў дэкрэт) хоча адкрыць фотастудыю, зноў жа не падобную ні на якія іншыя, і што там сапраўды будзе крута.



**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## Извещение о проведении 6 марта 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ №7»

| | |
|---|---|
При обращении к Эмитенту с целью ознакомления с Проспектом эмиссии Облигаций потенциальному инвестору (инвестору) представляется проспект эмиссии Облигаций и/или заверенная копия проспекта эмиссии Облигаций для обозрения (чтения).

И. о. директора
Эмитента — И. С. Соловьев

Главный бухгалтер
Эмитента — Л. Д. Карпинская
М.П.

SEX=БАЛЯСЫ

## ПРА ГЕНДАР

**Тлумачэнне гэтага слова інтуітыўна ведае амаль кожны. Менавіта інтуітыўна, а вось даць сходу дакладную фармулёўку паняцця неспецыялісту ў гэтай сферы будзе не вельмі проста. («Настаўнік пытаецца ў вучаніцы дзявятага класа: «— Маша, назаві будучы час дзеяслова «кахаць». — Выйсці замуж».) Хіба што са шпаргалкай, падгледжанай у інтэрнэце. Дык вось, з яе, у перакладзе на простую мову. Гендар — гэта сукупнасць сацыяльных і культурных нормаў, якія грамадства прадпісвае выконваць людзям у залежнасці ад іх біялагічнага полу. І мужчыны, і жанчыны павінны выконваць свае гендарныя ролі, якія гэта грамадства ім прыпісала. («Папілі дзве бландзінкі гарбаты. У чайніку застаўся кіпень. Адна пытаецца ў другой: «Шкада ж выліваць, можа, яшчэ спатрэбіцца. Што будзем рабіць?» Другая прапануе: «А давай у халадзільнік паставім?!») Натуральна, у розных грамадствах і ролі будуць розныя. Такім чынам, як падказвае ўсё той жа інтэрнэт, гендар — гэта сацыяльная мадэль чалавека, якая вызначае яго становішча ў грамадстве. («— Люся, ты з мухі робіш слана! — Ды я ўвогуле чараўніца!»)**

Адна чытачка вось такім чынам выказала сваё стаўленне да гэтай рубрыкі: дзякуй за гумар, цікавыя гісторыйкі, але ж — гендар... А што гендар? Я хлопчык, і як бы ні імкнуўся весці сам з сабой нябачную спрэчку нібыта яшчэ і ад імя жанчыны таксама, ні спрабаваў падстроіцца пад стыль унісекс, мая лішняя храмасома ўсё роўна дасць аб сабе знаць. («Насамрэч мужчынам неабходныя толькі дзве рэчы: жанчыны і адпачынак ад жанчын».) Пісала б чытачка нататкі, было б тое ж самае, толькі на жаночы капыл. Але чаму я завёў размову на тэму таго самага гендара? Мне падаецца, што як прастаму чалавеку цяжка адразу даць тлумачэнне гэтага паняцця, так жа яму часам складана ў нашым сучасным жыцці зразумець, хто ж і якія ролі выконвае насамрэч. (Памятаеце, што гаварыў у спрэчцы «Георгій Іванавіч, ён жа Гога, ён жа Гоша, ён жа Юрый, ён жа Жора» з фільма «Масква слязам не верыць»? «— Яна гэтым самым выявіла, што для яе сацыяльны статус чалавека вышэйшы, чым яго... мой асабісты статус! — Перакладзі, — прасіў сабутэльнік Коля») Вось і мне часам патрэбны такі пераклад...


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Не, я, канешне, яшчэ магу зразумець нядаўнюю гісторыю з канадскім гімнам, які нарэшце стаў «гендарна нейтральным». Там прынялі закон, што радок з яго «Патрыятызм — доля тваіх сыноў» трэба замяніць на «Патрыятызм — доля для ўсіх». Ну, сапраўды, а жанчына, што, не чалавек, не можа быць патрыётам? Папраўку ў гімн спрабавалі ўнесці больш за 30 гадоў, але толькі зараз здолелі дамагчыся таго. Тут пытанні хіба ўжо да тых «сыноў», якія столькі часу былі супраць папраўкі наконт «дачок» краіны. («Вельмі люблю мужчын, якія ўмеюць правільна і прыгожа гаварыць. Ведаю, што маняць... Але слухаць прыемна».)

Памятаеце навіну пра тое, што ў брытанскіх школах хлопчыкам дазволілі насіць... спадніцы. Ці сарафаны... Паведамлялася, што ў 80 такіх навучальных установах краіны (з іх у 40 пачатковых школах) ужо нельга будзе па адзенні вызначыць пол дзіцяці. Нововўвядзенне было прызвана ў раннім узросце выявіць тых з іх, хто не ўпэўнены ў сваёй гендарнай прыналежнасці. Праграму абяцалі прафінансаваць улады, але, што цікава, планавалася не апавяшчаць аб ёй у шырокіх колах. Чаму? Магчыма, таму, што адразу знайшліся праціўнікі такой ініцыятывы? У якой сферы хлопец у сарафане можа выявіць сваю індывідуальнасць? («Пяцікласнік Коля Сідараў знайшоў на карце Гандурас і сваю мянушку да заканчэння школы».) Пра мужнасць увогуле прамаўчу.

А вось больш свежая «цікавостка». Гімназія ў Манчэстэры — адна з найлепшых дзяржаўных школ Вялікабрытаніі — забараніла дзяўчатак называць... дзяўчаткамі. Супрацоўнікі павінны былі перайсці на «гендарна-нейтральную мову» з дзецьмі, вучаніцы для іх павінны былі стаць «вучнямі». Усё з-за таго, што некаторыя з апошніх ставяць пад сумнеў сваю гендарную ідэнтычнасць ці не ідэнтыфікуюць сябе як дзяўчаткі. («Калі твая чашка толькі напалову поўная... магчыма, табе патрэбны станік меншага памеру».) А яшчэ — каб не крыўдзіць транссексуалаў...

На гэтым фоне сапраўдным жаночым (ці нават мужчынскім, даруйце за парадокс) можна назваць учынак каля ста француженак на чале з Катрын Дэнёў, якія выступілі ў абарону дужага полу. Памятаеце гэты скандал у Галівудзе пра дамаганні, які ўжо ўсім надакучыў? («Спачатку жанчыны сцвярджаюць, што ў мужчыны мазгі паміж нагамі. А потым патрабуюць: «Паварушы мазгамі!» Непераможная жаночая логіка».) У пісьме яны абараняюць «жыццёва важнае для сексуальнай свабоды» права мужчын заляцацца да жанчын. Вось што значыць — олдскул! Не тое, што цяперашнія...

Але самая цікавая, на мой погляд, гісторыя пра гендар здарылася нядаўна не з людзьмі, а з... жывёламі. (Памятаеце, як спяваў Высоцкі: «У жоўтай спякотнай Афрыцы, у цэнтральной яе частцы, неяк раптам, па-за графікам, здарылася няшчасце... карацей так: адзін жыраф закахаўся ў антылопу».) У Польшчы ад фермера ўцякла карова Рыжуха, якая прыбілася да статку зуброў у Белавежскай пушчы. Рагулю хацелі здаць на мяса. («Калі ўся мая радня будзе ёй не рада, не наракайце на мяне — я сыду са статка!») Дык вось, зубры прынялі бяглянку, якая жыве з імі не адзін месяц, і нават ахоўваюць яе, не даючы фермеру забраць іх новую сяброўку. Ну што тут скажаш пра лясных волатаў? У іх з гендарам усё ў парадку...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «ДА МАЁЙ МУЗЫКІ ТРЭБА ДАКРАНУЦЦА»

***(Заканчэнне.***
***Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

***— Вы старшыня Асацыяцыі маладых беларускіх кампазітараў. Чым займаецца арганізацыя?***

— Мы ўваходзім у Беларускі саюз музычных дзеячаў, і, хоць наша асацыяцыя зараз не вельмі актыўная, у нас ёсць некаторыя прыватныя ініцыятывы. У пералік праектаў, да якіх маем дачыненне, уваходзіць некалькі культурна-сацыяльных ініцыятыў накшталт «Музыкі ў метро», калі ў метрапалітэне можна было паслухаць Баха і іншых кампазітараў. Мы дапамагалі арганізаваць акцыю да дня нараджэння Шапэна сумесна з Польскім інстытутам у гандлёвым цэнтры «Сталіца». Таксама падтрымалі выданне зборніка дзіцячых фартэпіянных п'ес.

***— Вы сталі першым беларускім кампазітарам, які паспрабаваў сябе ў форме Composer in residence: напісалі твор для Камернага аркестра Беларусі...***

— Такая практыка вельмі цікавая, але плён прынясе, толькі калі будзе паўсюдным: гэтая форма павінна быць у кожным калектыве са штогадовай зменай кампазітара, па конкурсе ці валявым рашэнні кіраўніка. Напрыклад, для заходніх тэатраў гэта абавязковы спосаб супрацоўніцтва, бо напісаць оперу ці балет — тытанічная праца. А тут творца працуе толькі над гэтым праектам і адкідвае ўсё астатняе, за гэта яго забяспечваюць грашовай падтрымкай. Нашы кампазітары гатовыя пісаць музыку бясплатна, а калі ім будуць яшчэ хоць колькі плаціць — вынік будзе неверагодны! Упэўнены, што такую форму трэба ўвесці як абавязковую і гэта вырашыць шэраг праблем: калектывы будуць мець новы рэпертуар, а кампазітары — працу.



***— Пісаць для вялікай групы музыкантаў — вельмі адказна. Ці лёгка аркестр пайшоў на кантакт?***

— Гэта вельмі прафесійны калектыў, які многаму мяне навучыў: хоць бы таму, што мне шмат чаму яшчэ трэба вучыцца! Мне пашанцавала з аркестрам: там ёсць касцяк музыкантаў, паміж якімі заўважная моцная сувязь, яны працуюць як адзіны арганізм, разумеюць і адчуваюць адзін аднаго ў прафесійным плане. Вакол гэтага калектыву ёсць асаблівая аўра, і я змог уявіць, якую музыку ім было б цікава іграць, які твор раскрыў бы аркестр у большай ступені. Такое вывучэнне, паглыбленне ў атмасферу таксама істотнае для кампазітара, каб ён разумеў, як дзейнічае гэты арганізм. Таму Composer in residence важны яшчэ і з гэтага пункту гледжання, хоць ёсць небяспека, што кантакт паміж аўтарам музыкі і выканаўцамі не ўсталюецца. Але гэта не мой выпадак: я прыслухоўваўся да парад Яўгена Бушкова і прапаной музыкантаў.

***— Як вынік вы прадставілі містэрыю «Красны Макошы», у якой праявілася ваша любоў да беларускай народнай творчасці...***

— Так, фальклор заўсёды быў для мяне крыніцай інспірацыі, народная музыка натхняе мяне інтанацыйна. Я дакладна ведаў, што гэта будзе твор для народнага голасу і аркестра, Бушкова таксама захапіла ідэя ўвесці народны тэмбр, знак нацыянальнай культуры. Хацелася напісаць жаночы твор, таму што беларуская традыцыя спеваў дзесьці на 80 працэнтаў жаночая, як і тэматыка песень. Таму было цікава стварыць абагульнены вобраз беларускай жанчыны ў народнай культуры: ідэя кола і кругавароту зразумелая кожнаму і актуальная, а кола каляндарнае тоеснае колу чалавечага жыцця, і прырода таксама развіваецца па гэтай схеме. Цыклічнасць прыроды і жыцця жанчыны вельмі падобныя і ў беларускім фальклоры, а жаночы пачатак заўсёды быў тоесны зямлі — яны абедзве даюць жыццё. Разам з салісткай Эвелінай Шчадрынай мы вельмі доўга выбіралі песні для праекта, як, дарэчы, і назву: хацелася, каб яна была звязана з духоўнай сферай, і слова «кросны» падалося мне трапным — ткацтва заўжды было сакральным працэсам з сімвалічным значэннем.

***— А якія яшчэ тэмы натхняюць на музычныя творы?***

— Рэальнасць, але гэта шырокае паняцце. Творчы працэс для мяне — лесвіца, а першая яе прыступка — імпульс з боку, напрыклад заказ ад кагосьці. І я прыблізна ведаю, якім павінен быць склад кампазіцыі: якім можа быць гучанне інструмента ці голасу. А далей пачынаю шукаць тэму, якая была б сугучнай кантэксту. У апошні час мяне натхняе штосьці звязанае з простымі рэчамі — важна, каб у творы была выразная ідэя і мінімальныя сродкі, такі аскетызм. Мне падабаецца эстэтыка «новай прастаты», і я знаходжу ў ёй шмат ідэй. Думкі выражаюцца максімальна лаканічна і дакладна. Я б сказаў, слухач павінен ледзьве не дакрануцца да майго твора, каб ён разумеў, пра што размаўляю з ім на музычнай мове.

***— Разам з класічнай музыкай вы цікавіцеся і электроннай — напісалі два альбомы...***

— Я ўспрымаю электроніку ў якасці сродку: чаму б не выкарыстаць усе магчымасці? Прычым з дапамогай камп'ютарных праграм можна дасягаць самых неверагодных мастацкіх эфектаў і перадаваць новую эстэтыку, якая не ўласцівая акадэмічнай музыцы. Гэта цікава і прагрэсіўна, а такога гучання ніколі не дасягнеш праз акустычныя інструменты. Таму электроніка — цэлы сусвет, і калі займацца ёй сур'ёзна, то можна пісаць музыку наогул без акустычных інструментаў і яна будзе не горшай, са сваёй эстэтыкай і падыходамі. Альбомы, якія выпусціў, не зусім самастойныя: я ствараў іх з беларускім электронным музыкантам Аляксандрам Цурко, менавіта ён «уцягнуў» мяне ў электроніку, мы стварылі разам два эксперыментальныя праекты. Я выкарыстоўваю электроніку і сам, напрыклад, калі агучваю фільмы падчас фестывалю «Кінема».

***— Кажуць, што ў літаратуры існуе абмежаваная колькасць сюжэтаў. А што з музыкай? Яна — бясконцая?***

— Музыка можа быць гучнай і ціхай, у ёй ёсць кульмінацыі і спады, вось і ўсе формулы. Але і кампазітар, і дасведчаны слухач цікавіцца, як гэтая формула іграе ў дадзенай сітуацыі і ў канкрэтнага чалавека — мастацтва кампазіцыі менавіта ў вывучэнні такіх схем і заключанае. У гэтым сэнсе музыка невычарпальная, як і іншыя віды мастацтва.

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 14.02.2018 г.

# ПОДЗВІГ ЗА АПЕРАЦЫЙНЫМ СТАЛОМ

## У Кандагары было не да вучобы

Пра ваенна-палявую хірургію да вайны ў Афганістане малады ўрач Іван Барысюк ведаў хіба што з кніг. Так, выязджаў з вайскоўцамі ў поле, дзе ў лепшым выпадку даводзілася выдаляць апендыцыт або аперыраваць грыжу. Тады начальнік хірургічнага аддзялення ваеннага шпіталя ў Ашулуку нават уявіць не мог, што неўзабаве будзе аказваць медыцынскую дапамогу ў экстрэмальных умовах. Насамрэч, ратаваць жыцці!

— Я тады была на вучобе ў Баку, як Іван напісаў, што адпраўляецца ў Ленінград на курсы ваенна-палявой хірургіі, — успамінае жонка вайскоўца. — Закралася сумненне. Пра Афганістан у той час мы мала ведалі, але чуткі, што там адбываецца, усё ж даходзілі. Вярнулася я дамоў, як ужо быў падпісаны загад — муж адпраўляецца на вайну.

У Кандагар Іван Барысюк прыехаў маёрам медыцынскай службы. Вопытнаму хірургу адразу даверылі ўзначаліць хірургічнае аддзяленне ваеннага шпіталя. З такімі пацыентамі дагэтуль яму не даводзілася сустракацца, таму вучыўся наноў — адразу за аперацыйным сталом. Дзякуючы яму цяжкапараненыя байцы хутка ішлі на папраўку і вярталіся ў строй.

— Іван Уладзіміравіч расказваў, што былі выпадкі, калі і па трое сутак не выходзіў з аперацыйнай, — гаворыць Валянціна Барысюк. — Санітары толькі падавалі яму каву ды цыгарэты. Пасля таго як былі пакладзены апошнія швы, а новых параненых яшчэ не паступіла, абяссілены, ён правальваўся ў сон.

Аднойчы ад мужа доўга не было лістоў, а цынкавыя труны ўжо прыходзілі... Жонка ўзяла сябе ў рукі і пайшла ў ваенкамат: на шчасце, сумненні не пацвердзіліся. Тады Валянціна Іванаўна напісала ліст начальніку ваеннага шпіталя Кандагара. Нарэшце, прыйшоў адказ і выклік — яе веды як тэрапеўта таксама на вайне былі б не лішнімі.

— Я ўжо збіралася ехаць, але ваенны камісар папярэдзіў: калі я не хачу пакінуць сына круглым сіратой (Валодзя ўжо ў другі клас хадзіў), то павінна адмовіцца ад свайго рашэння, — расказвае Валянціна Барысюк. — І сёння ўдзячна таму ваенкаму за горкую, але праўду.

## Другі шанц

За час свайго знаходжання ў Кандагары Іван Барысюк выратаваў не адзін дзясятак маладых жыццяў. Але выпадак, які адбыўся з радавым 103-й паветрана-дэсантнай дывізіі Валянцінам Юрчанкам, яму запомніўся назаўжды.

Падчас адной перастрэлкі з душманамі ўкраінскі хлопец быў моцна паранены. З такім дыягназам — кантузія сэрца і лёгкага, адрыў дыяфрагмы — здавалася, жыццё другіх шанцаў не давала. Але Іван Барысюк усё ж рызыкнуў...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



**Палкоўнік медыцынскай службы Іван БАРЫСЮК.**



**Калі б не адважнасць ваеннага хірурга, Валянцін ЮРЧАНКА застаўся б інвалідам.**

У хлопца не было ні дыхання, ні сэрцабіцця, у прамым сэнсе адвалілася дыяфрагма, якую немаведама чым трэба было прышываць, — падобнага ваенны хірург не бачыў нават у самым страшным сне. Доўгія гадзіны над параненым — і ён пачаў дыхаць, забілася сэрца. Здавалася, можна было ўздыхнуць, але нешта было не тое з рукой. Іван Уладзіміравіч выклікаў рэнтгенолага, вердыкт якога проста ашаламіў: у левым прадплеччы — граната! Не абнадзеіў і сапёр, які тут жа прыбыў у аперацыйную: узарвацца боепрыпас ці не, сказаць было складана.

— Канешне, прасцей за ўсё і разумна было б ампутаваць хлопцу руку, але Ваня не дапусціць, што салдат на ўсё жыццё застанецца інвалідам, — кажа Валянціна Іванаўна. — Ён выгнаў усіх з аперацыйнай і сам узяўся за скальпель. Гранату даставаў без спецыяльных інструментаў, нікто не думаў тады і пра бронекамізэльку.

А выбух усё ж раздаўся... Толькі адбылося гэта не ў аперацыйнай, а ў спецыяльна прызначаным месцы.

## Сакрэтная карэспандэнцыя

Пра тое, што магла тады застацца ўдавой, Валянціна Барысюк даведалася праз шмат гадоў пасля ўнікальнай аперацыі. Яе муж не любіў пра гэта расказваць: лічыў, што на яго месцы так паступіў бы любы кваліфікаваны хірург. Магчыма, так нікто і не даведаўся б пра гэты выпадак, калі б не ліст, які аднойчы трапіў у паштовую скрыню Барысюкоў.

Аказалася, воін-інтэрнацыяналіст адсочваў лёсы найбольш запамінальных сваіх пацыентаў. Не мог ён не пацікавіцца і тым, як склалася жыццё ў Валянціна Юрчанкі. Той, дарэчы, быў да канца сваіх дзён удзячны выратавальніку. У гэтым лісце ён чарговы раз пісаў самыя шчырыя словы ў адрас Івана Уладзіміравіча. Апошняму прыйшлося растлумачыць жонцы, адкуль карэспандэнцыя і, галоўнае, — з якой нагоды. У тым канверце, па ўспамінах жонкі, ляжаў яшчэ і фотаздымак, на якім Валянцін Юрчанка трымаў на руках сваю нявесту. Неўзабаве жонка падарыла воіну-афганцу дзвюх дачок.

Між іншым, ва ўкраінскім горадзе Белая Царква, дзе жыў Валянцін Юрчанка, пра подзвіг Івана Барысюка ведалі многія: хлопец расказаў сваім землякам пра чалавека, які вярнуў яго з таго свету. Неўзабаве ў мясцовым музеі з'явілася адпаведная інфармацыя. Іван Уладзіміравіч неяк ездзіў у Белую Царкву, дзе, акрамя Валянціна, сустрэў яшчэ чалавек пяць, каго аперыраваў у Кандагары.

## Перажываў за кожнага пацыента

Пасля вяртання з Афганістана Іван Барысюк на розных пасадах працягваў быць верным клятве Гіпакрата. Служыў у Барысаве, Бабруйску, дзе быў намеснікам галоўнага ўрача па медыцынскай частцы. Як прызнаецца жонка, хірургу-практыку адміністрацыйная работа не прыносіла задавальнення. Затым была служба ў Венгрыі, і амаль усюды з ім была яго сям'я. Не дзіва, што адзіны сын таксама абраў прафесію ўрача.

Іван Барысюк мог застацца ў Мінску (некаторы час працаваў у цяперашнім 432-м Галоўным ваенным клінічным медыцынскім цэнтры Узброеных Сіл), але вярнуўся ў Барысаў, дзе доўга ўзначальваў 592-і ваенны шпіталь.

— Вайна ў Афганістане яго настолькі загартавала, што аперыраваў усё: з пятак да галавы, — расказвае Валянціна Барысюк. — Ён неяк мне прызнаўся, што калі б не атрыманы на вайне вопыт, наўрад ці калі адважыўся б на трэпанацыю чэрапа. Увогуле, перажываў за кожнага хворага, цікавіўся іх самаадчуваннем нават па выхадных. Ведаў кожнага свайго супрацоўніка, хто чым жыве. Яны, у сваю чаргу, былі ўдзячныя яму не толькі за ўвагу, але і бясцэнны вопыт, які Іван Уладзіміравіч не шкадаваў дзяліцца.

Невыпадкова напярэдадні 75-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў гонар воіна-інтэрнацыяналіста, палкоўніка медыцынскай службы на тэрыторыі шпіталя ў Барысаве з'явіўся памятны камень. А не стала народнага ўлюбёнца ў кастрычніку 2010 года...

— На 40 дзён да нас прыязджаў той самы Валянцін Юрчанка, якога муж ні ў якім выпадку не мог пакінуць інвалідам, — кажа Валянціна Барысюк. — Нядаўна ён і сам пайшоў з жыцця: канчаткова пазбавіў здароўя Чарнобыль, куды разам са сваім сябрам-афганцам добраахвотна паехаў ліквідаваць наступствы аварыі.

## Забыты подзвіг

За добрасумленнае выкананне інтэрнацыянальнага доўгу Іван Барысюк быў узнагароджаны савецкім ордэнам «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені. Але гэтую ўзнагароду давалі многім, хто служыў у Афганістане.

Толькі ён ніколі не прэтэндаваў на большае, хоць добра разумеў, што тады, у чэрвені 1982-га, упершыню ў гісторыі савецкай, а можа, і сусветнай, медыцыны без спецыяльных інструментаў і сродкаў абароны ў адзіночку выняў з чалавека неразарваны боепрыпас.



**Палкоўнік медыцынскай службы Іван БАРЫСЮК *(другі справа)* і выратаваны ім радавы Валянцін ЮРЧАНКА *(крайні справа).***

— Аднойчы пра падобны выпадак, які адбыўся чатырма гадамі пазней у Ташкенце, я прачытала ў «Комсомольской правде», якую дагэтуль захоўваю, — успамінае жонка ваеннага ўрача. — Але тады граната не ўзарвалася (хутчэй за ўсё, была небаяздольнай), а падчас аперацыі хірургічная брыгада працавала са спецыяльнымі інструментамі і ў сродках ахову на выпадак выбуху, ды і было гэта не ў ваенна-палявых умовах. Хірурга ўзнагародзілі ордэнам. Я дагэтуль ніколі нікуды не пісала, але мне стала так крыўдна, што я звярнулася да рэдакцыйнага калектыву, расказаўшы гісторыю свайго мужа. Адказу так і не атрымала...

Сёння гэтую гістарычную несправядлівасць спрабуюць выправіць актывісты барысаўскай арганізацыі Беларускага саюза афіцэраў. Але пакуль безвынікова. Магчыма, калісьці праўда пераможа і герой атрымае заслужаную ім узнагароду.

**Вераніка КАНЮТА.**

---

### ■ Новыя кнігі

## «ПЁТР МАШЭРАЎ: ЖЫЦЦЁ. ЛЁС. ПАМЯЦЬ»

**Аб'ёмная і шматгранная фігура Пятра Міронавіча Машэрава выклікае вялікі інтарэс да яго дзейнасці ў палітыкаў, гаспадарчых і партыйных дзеячаў, пісьменнікаў. Не з'яўляецца выключэннем і кніга Славаміра Антановіча, якая выйшла ў пачатку гэтага года, — гістарычна-публіцыстычны раман «Пётр Машэраў: Жыццё. Лёс. Памяць».**




Розныя праходзяць перад чытачом рамана людзі. Тут і бацька героя, які ў 1937 годзе па лжывых даносах аднавяскоўца быў арыштаваны і дамоў ужо не вярнуўся, і маці Дар'я Пятроўна (выхавала трох дачок і двух сыноў, загінула ад рук фашыстаў у верасні 1942 года). На старонках твора апавядаецца пра студэнцкія гады Пятра ў сценах Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. Кірава, яго сустрэчах з братам Паўлам, сёстрамі Вольгай, Надзеяй, Матронай, яго заляцаннях да будучай жонкі Паліны, аб узаемаадносінах Паліны Андрэеўны з яго сяброўкай Тацянай Прытыцкай, дзелавых перамовах Пятра Міронавіча з паплечнікамі па партыі і вядомымі партыйнымі, дзяржаўнымі дзеячамі, як Леанід Брэжнеў, Андрэй Грамыка, Тодар Жыўкаў, Фідэль Кастра ды іншымі.

Славамір Антановіч з уласцівай яму як юрысту ўседлівасцю і скрупулёзнасцю, усё глыбей пагружаецца ў метафізічныя рэаліі беларускай рэчаіснасці і гісторыі, даследуе методыку працоўнай дзейнасці знакамітага кіраўніка рэспублікі Пятра Міронавіча Машэрава. Аўтар імкнецца перадаць нашчадкам матывы той эпохі, у якой жыў сапраўдны герой яго твора. Тут і вера ў прыгажосць свету і разнастайнасць, бязмежжа людскіх характараў хлебаробаў, шахцёраў, навукоўцаў, студэнтаў, землякоў, з якімі часта сустракаўся кіраўнік дзяржавы, працу якіх вельмі шанаваў, і жахі вогненнага ліхалецця, і свежае дыханне Вялікай Перамогі, і прамяністасць кожнага стваральнага дня. Змяняліся сацыяльна-культурныя, грамадска-палітычныя абставіны ў краіне, якія добрасумленна адлюстраваны аўтарам у яго ным творы.

Пісьменнік змог пераарыентавацца і літаральна ўбачыць, сканцэнтраваць увагу чытача на тых эпізодах жыцця і дзейнасці Пятра Міронавіча Машэрава, яго ных чалавечых якасцях, якія ўласцівы вялікаму палітычнаму лідару, стратэгу і інтэлігенту высокага рангу. Партыйны лідар рэспублікі, як сведчыць кніга Славаміра Антановіча, далікатна ўзважваючы тыя ці іншыя падзеі ў Беларусі і свеце на шалях эпохі, уважліва ставіўся да пісьменнікаў і іх творчасці, праяўляў клопат пра дзеячаў культуры, паляпшаў сацыяльна-бытавыя ўмовы.

Думаецца, гістарычна-публіцыстычны раман «Пётр Машэраў: Жыццё. Лёс. Памяць» які вызначаецца багаццем зместу і разнастайнасцю сродкаў мастацкага адлюстравання падзей, стане яркай зоркай на небасхіле беларускай дакументальнай прозы.

**Валянцін БАРЫСЕВІЧ** ■

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Оршаагропроммаш», Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, 215 |

**Предмет аукциона**

| Наименование (Назначение) | Общая площадь | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Склад баллонов**<br>(Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 306 кв. м | 110/С-85254 | г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/ 23 |

Составные части и принадлежности: *Одноэтажное блочно-кирпичное здание склада баллонов с рампой*

***Сведения о земельном участке***: пл. ***0,5083*** га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания склада баллонов

**Начальная цена с НДС 20 % – 36 720,00 бел. руб.**

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

**Задаток 1 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 20.03.2018 в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 16.03.2018 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении электронных торгов по продаже трехкомнатной квартиры в г. Москва, принадлежащей ОАО «БМЗ-управляющая компания холдинга «БМК»

**Лот № 070218001.** Трехкомнатная квартира с кадастровым (или условным номером) 77:07:0001002:22536. Г. п. – 1986. Назначение: жилое. Общая площадь – 75,3 кв. м. Жилая площадь – 46,4 кв. м. Этаж – 3. Наличие инженерных коммуникаций: водопровод – централизованный; канализация – централизованная; отопление – центральное от ТЭЦ; горячее водоснабжение – централизованное; электроснабжение – 220 В. Скрытая проводка. **Местоположение лота**: Российская Федерация, г. Москва, ул. Осенняя, д. 22, кв. 12

| **Начальная цена (без учета НДС), рос. руб. –** 14 779 686,14 | **Задаток, рос. руб. –** 1 500 000,00 | **Шаг электронных торгов –** 5 % |
|---|---|---|

УСЛОВИЯ

1. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета электронных торгов в 10-дневный срок после утверждения протокола.
2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу стоимость приобретенного на электронных торгах предмета электронных торгов в течение 5 (пяти) дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента утверждения протокола о результатах электронных торгов.

Сумма для оплаты затрат на организацию и проведение электронных торгов производится в белорусских рублях либо российских рублях с применением курса Национального банка Республики Беларусь на дату проведения электронных торгов.

4. Валюта торгов – российский рубль.
5. Валюта платежа:

– для резидента Республики Беларусь – белорусский рубль по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа;

– для нерезидента Республики Беларусь – российский рубль.

6. Задаток за участие в аукционных торгах устанавливается в российских рублях.

При внесении задатка в белорусских рублях сумма платежа определяется по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату внесения задатка.

7. Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь во исполнение настоящего договора осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты и проведение валютных операций.
8. Государственная регистрация перехода права собственности на предмет электронных торгов осуществляется за счет Победителя электронных торгов (Претендента на покупку) после полной оплаты стоимости приобретенного на электронных торгах предмета электронных торгов.
9. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь

**Дата и время начала проведения электронных торгов 20.03.2018 г. в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденных постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г.

**Продавец:** ОАО «БМЗ – управляющая компания холдинга «БМК» 247210, Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Промышленная, 37, тел. 8 (02334) 5-45-20, ф. 8 (02334) 3-10-70.

**Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки:** РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.

**Электронный адрес ЭТП:** http://торги. бел.

Задаток в российский рублях перечисляется на р/с BY57BLBB30120190055182001006 в ОАО «Белинвестбанк», BIC банка BLBBBY2X, г. Минск, пр-т Машерова, 29, не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах по продаже квартиры, принадлежащей ОАО «БМЗ-управляющая компания холдинга «БМК» (лот № 070218001), проводимых 20 марта 2018 г. Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляются на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». **Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами**: 15.03.2018 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметами. Контактные лица для осмотра Предметов электронных торгов: Бондаренко Владимир +74956496537 доб. 200. Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги. бел.)

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: tb@ino.by**

## ОАО «Дзержинский экспериментально-механический завод» проводит открытый аукцион по продаже имущества

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС, руб. РБ | Сумма задатка (10 % от первоначальной цены) с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|
| 1 | Производственное помещение (номер 620/D-17263) общей площадью 210,9 кв. м по адресу: Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых, 46 | 29 296 руб. 90 коп. | 2 929 руб. 69 коп. |
| 2 | Производственное помещение (номер 620/D-17264) общей площадью 254,2 кв. м по адресу: Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых, 46 | 35 097 руб. 40 коп. | 3 509 руб. 74 коп. |
| 3 | Помещение многофункциональное (номер 620/D-17265) общей площадью 691,4 кв. м по адресу: Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых, 46 | 99 598 руб. 96 коп. | 9 959 руб. 90 коп. |

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с BY580LMP30121000155410000933 в ОАО «Белгазпромбанк» г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, код банка OLMPBY2X, МФО 153001742, УНП 600004946, ОКПО 05550337.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится 16 марта 2018 г. в 10.00 по адресу: Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых, 46. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 12 марта 2018 г. до 12.00 по указанному адресу.

Для участия в аукционе претенденты предоставляют: заявление (в произвольной форме); заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; юридические лица предоставляют доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; физические лица – копию паспорта.

Контактные телефоны: +375 44 554-44-85, +375 44 554-45-25, +375 1716 5-69-24

| | |
|---|---|
| Организатор торгов | Ликвидатор Общества с дополнительной ответственностью «ИнтерМастерЛюкс» – ООО «Парусник»: 210029, г. Витебск, ул. Правды, 48, каб. 11; тел.: 8 0212 68-75-96, +375 44 585-88-52, +375 29 516-03-00 |
| Продавец | Общество с дополнительной ответственностью «Интер МастерЛюкс», тел. 8 0212 68-75-96, +375 44 585-88-52, +375 29 516-03-00 |
| Дата, время, место и форма проведения торгов | Торги в форме открытого аукциона **20.03.2018 года в 12.00** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 48, каб. 30 |
| Сведения о предмете торгов, порядок ознакомления с ним и начальная цена предмета торгов (без НДС) | **Лот № 1:** капитальное строение с инв. № 200/С-84021, наименование – «Производственная база по изготовлению стройматериалов и конструкций», общая площадь – 197,1 кв. м; капитальное строение с инв. № 200/С-55791, наименование – «Шестисекционная пропарочная камера», общая площадь – 206,2 кв. м; капитальное строение с инв. № 200/С-55790, наименование – «Бетонная площадка», общая площадь – 717,8 кв. м. Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 240100000001005049, земельный участок принадлежит продавцу на праве постоянного пользования (св-во № 200/1229-3047 от 27.09.2017).<br>Начальная цена – 91 900,00 бел. руб.<br>**Лот № 2:** Бетоносмеситель СБР-170А (170 л, 380В/0,7 кВт, 78 кг); начальная цена – 468,65 бел. руб.<br>**Лот № 3:** Бытовка строительная; начальная цена – 3 232,50 бел. руб.<br>**Лот № 4:** Гильотина МП2А; начальная цена – 690,00 бел. руб.<br>**Лот № 5:** Грузовой специальный автокран УРАЛ 43202, 1989 г. в.; начальная цена – 1 800,00 бел. руб.<br>**Лот № 6:** Нагреватель переносной дизел. Master B 150 CEDпрям.; начальная цена – 651,67 бел. руб.<br>**Лот № 7:** Ножницы гильотинные Н3121; начальная цена – 860,00 бел. руб.<br>**Лот № 8:** Полуавтомат Powertec 302C4R400V3Ph (R14056-3); начальная цена – 1 382,00 бел. руб.<br>**Лот № 9:** Станок вертикально-сверлильный СТ-1С-4,5КвТ; начальная цена – 3 250,00 бел. руб.<br>**Лот № 10:** Станок для гибки арматуры СГА-1; начальная цена – 315,00 бел. руб.<br>**Лот № 11:** Станок для гибки арматуры СГА-1; начальная цена – 166,00 бел. руб.<br>**Лот № 12:** Станок сверлильный 2Н 118; начальная цена – 556,00 бел. руб.<br>**Лот № 13:** Станок токарный ИТ-100КЛ Н; начальная цена – 3 250,00 бел. руб.<br>**Лот № 14:** Аппарат для нагрева и охлаждения воды; начальная цена – 116,67 бел. руб.<br>**Лот № 15:** Влагомер Testo 606-1 (бетон) арт. 6-2-353; начальная цена – 276,45 бел. руб.<br>**Лот № 16:** Гигрометр ВИТ-1 арт. 8-4-118; начальная цена – 7,76 бел. руб.<br>**Лот № 17:** Домкрат 20т; начальная цена – 44,96 бел. руб.<br>**Лот № 18:** Дрель электр. Makita HP 1640; начальная цена – 69,78 бел. руб.<br>**Лот № 19:** Дрель-шуруповерт аккум. Makita 6271 DWPE; начальная цена – 127,62 бел. руб.<br>**Лот № 20:** Заклепочник рычажный 2,4 мм, 3,2 мм, 4,0 мм, 4,8 мм Topex; начальная цена – 22,82 бел. руб.<br>**Лот № 21:** Кресло для офиса Менеджер; начальная цена – 84,90 бел. руб.<br>**Лот № 22:** Кресло для офиса Менеджер; начальная цена – 84,90 бел. руб.<br>**Лот № 23:** Кресло для офиса Менеджер; начальная цена – 84,90 бел. руб.<br>**Лот № 24:** Миксер-дрель Фиолент МД1-11Э (1100 Вт) без насадки; начальная цена – 120,26 бел. руб.<br>**Лот № 25:** Мышь A4 OP-720 black optical PS/2 + USB; начальная цена – 1,75 бел. руб.<br>**Лот № 26:** Набор щупов № 2 100мм; начальная цена – 6,01 бел. руб.<br>**Лот № 27:** Нивелир ATLAS KL20; начальная цена – 102,82 бел. руб.<br>**Лот № 28:** Отвес малярный, РП; начальная цена – 2,91 бел. руб.<br>**Лот № 29:** Перфоратор эл. KHE-3251 05/metabo 600659000; начальная цена – 398,00 бел. руб.<br>**Лот № 30:** Печь микроволновая бытовая; начальная цена – 80,78 бел. руб.<br>**Лот № 31:** Полка (Т160/Тема/М/горск); начальная цена – 15,83 бел. руб.<br>**Лот № 32:** Полка (Т520/Тема/М/горск); начальная цена – 10,10 бел. руб.<br>**Лот № 33:** Рейка нивелирная CST/Berger 805M (5 м); начальная цена – 27,16 бел. руб.<br>**Лот № 34:** Таль ручная шестеренная стационарная ТВ1,0тн/0,9 м; начальная цена – 330,00 бел. руб.<br>**Лот № 35:** Термометр ТТМК П2 103 (-35..+50) арт. 8-12-728; начальная цена – 3,88 бел. руб.<br>**Лот № 36:** Термометр ТТМК П2 103 (-35..+50) арт. 8-12-728; начальная цена – 3,88 бел. руб.<br>**Лот № 37:** Угольник поверочный УП 160х100 кл. арт. 2-72-15; начальная цена – 20,37 бел. руб.<br>**Лот № 38:** Шлифмашина углов. Makita; начальная цена – 145,81 бел. руб.<br>**Лот № 39:** Шлифмашина углов. Makita; начальная цена – 149,02 бел. руб.<br>**Лот № 40:** Шлифмашина углов. Makita GA9020; начальная цена – 114,64 бел. руб.<br>**Лот № 41:** Клавиатура; начальная цена – 14,35 бел. руб.<br>**Лот № 42:** Уровень; начальная цена – 12,00 бел. руб.<br>**Лот № 43:** Сварочный аппарат MIG S240 PRO; начальная цена – 468,33 бел. руб.<br>**Лот № 44:** Сварочный аппарат FUBAG; начальная цена – 385,00 бел. руб.<br>**Лот № 45:** Сварочный аппарат; начальная цена – 318,20 бел. руб.<br>**Лот № 46:** Сварочный аппарат; начальная цена – 385,00 бел. руб.<br>**Лот № 47:** Плотномер динамический Д 51А (сумка-чехол) 5-5-152; начальная цена – 69,84 бел. руб.<br>**Лот № 48:** Балка базы L=2 м (8 шт.); балка настила 3,0 м (8 шт.); горизонталь (27 шт.); диагональ (24 шт.); кронштейн анкера 48 (9 шт.); опорная пята 42 150х150 (12 шт.); рама проходная 42 (2 шт.); секция «Вектор 04», h=1,2 м (18 шт.); стабилизатор в сборе (4 шт.); щиты деревянные (11 шт.); нижняя опора базы «Вектор 04» (10 шт.); крепежи (5 шт.); начальная цена – 1 664,57 бел. руб.<br>**Лот № 49:** Правило (2 м); начальная цена – 20,00 бел. руб.<br>**Лот № 50:** Сварочный аппарат ТДМ-503У2; начальная цена – 362,08 бел. руб.<br>**Лот № 51:** Видеонаблюдение; начальная цена – 984,54 бел. руб.<br>**Лот № 52:** Стол письменный (Т300/Тема/М/Горск); начальная цена – 43,72 бел. руб.<br>**Лот № 53:** Стол письменный (Т312П/Тема/М/Горск); начальная цена – 64,75 бел. руб.<br>**Лот № 54:** Стол-приставка (МЛ328/1/РеномеЛюкс/кшт Ф6); начальная цена – 268,47 бел. руб.<br>**Лот № 55:** Тачка строительная ТС-2Р, 85 л, разборная; начальная цена – 48,75 бел. руб.<br>**Лот № 56:** Тачка строительная ТС-2Р, 85 л, разборная; начальная цена – 48,75 бел. руб.<br>**Лот № 57:** Лестница стремянка; начальная цена – 45,61 бел. руб.<br>**Лот № 58:** Поддон RP-2 80*120; начальная цена за 1 шт. – 128,65 бел. руб.<br>**Лот № 59:** Поддон RP-2 80*120; начальная цена за 1 шт. – 128,65 бел. руб.<br>**Лот № 60:** ПЭВМ т. м. HAFF модель Maxima; начальная цена – 245,83 бел. руб.<br>**Лот № 61:** Стол письменный (МЛ321/1/РеномеЛюкс/кшт Ф6); начальная цена – 357,27 бел. руб.<br>**Лот № 62:** Стол письменный (МЛ321/1/РеномеЛюкс/кшт Ф6); начальная цена – 357,27 бел. руб.<br>**Лот № 63:** Эл. обогр. масл. 2,0 квТ мод. DF-200C-9; начальная цена – 38,56 бел. руб.<br>**Лот № 64:** Эл. обогр. масл. 2,0 квТ мод. DF-200C-9; начальная цена – 38,56 бел. руб.<br>**Лот № 65:** Эл. обогр. масл. 2,0 квТ мод. DF-200C-9; начальная цена – 38,56 бел. руб.<br>**Лот № 66:** Эл. обогр. масл. 2,0 квТ мод. DF-200C-9; начальная цена – 38,56 бел. руб.<br>**Лот № 67:** Эл. обогр. масл. 2,0 кВт мод. GYD-P-9; начальная цена – 61,21 бел. руб.<br>**Лот № 68:** Аппарат факсимильный Panasonik KX-FT984R; начальная цена – 179,51 бел. руб.<br>**Лот № 69:** Ноутбук SAMSUNG; начальная цена – 375,50 бел. руб.<br>**Лот № 70:** Тумба под офисную технику CANON IR2520; начальная цена – 91,67 бел. руб.<br>Ознакомиться с предметом торгов, а также узнать подробную информацию можно в пн.–пт. с 9.30 до 17.00 по тел.: 8 0212 68-75-96, +375 244 585-88-52. Срок для ознакомления – до окончания приема заявок на участие в торгах |
| Место нахождения предмета торгов | г. Витебск, ул. Терешковой, 13Ж (лоты №№ 1–2, 4, 6–13, 48, 50, 55–56, 58–59) г. Витебск, ул. Правды, 48 (лоты №№ 14–47, 49, 57, 60, 68–69) г. Витебск, ул. С. Панковой, 11 (лоты №№ 3, 51–54, 61–67, 70) Витебская область, Витебский р-н, д. Ранино (лот № 5) |
| Порядок проведения торгов | Торги проводятся в день, время и месте, указанные в извещении. Шаг торгов – 5 % от начальной цены лота. Победителем торгов признается лицо, предложившее наибольшую цену. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что на участие в торгах подано заявление только одним участником либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Организатор торгов имеет право не позднее чем за 5 дней до его начала снять с аукциона предмет торгов или отказаться от проведения торгов |
| Порядок оплаты приобретенного предмета торгов | Участник, выигравший торги, обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 15 банковских дней с даты подписания договора купли-продажи предмета торгов |
| Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, банковские реквизиты для перечисления | Задаток устанавливается в размере 10 % от начальной цены лота и подлежит зачислению по следующим реквизитам: р/с № BY06 PJCB 3012 2012 8610 0000 0933 в ЦБУ № 200 ОАО «Приорбанк», БИК PJCBBY2X, УНП 391353663, получатель платежа – ОДО «ИнтерМастерЛюкс», назначение платежа – задаток за участие в торгах (по лоту №№). Задаток подлежит внесению до подачи заявления на участие в торгах. Заверенный банком платежный документ, подтверждающий внесение задатка, прилагается к заявлению |
